Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

5 ЛІПЕНЯ 2007 г.
ЧАЦВЕР
№ 123 (25988)
Кошт 380 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка наведаў заключны гала-канцэрт рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі «За незалежную Беларусь!», які прайшоў вечарам 3 ліпеня ў беларускай сталіцы каля стэлы «Мінск — горад-герой».

У першай частцы гала-канцэрта была прадстаўлена тэатралізаваная праграма з удзелам народных калектываў, юных салістаў дзіцячых ансамбляў, майстроў цырка і спартсменаў, эстрадных выканаўцаў. За пяць хвілін да святочнага феерверку каля стэлы адбылася патрыятычная акцыя «Спяём гімн разам!». Зводныя хор і аркестр, а таксама гледачы, якія сабраліся на канцэрт, выканалі Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь. Такая ж акцыя адначасова прайшла ва ўсіх абласных цэнтрах рэспублікі. Пасля завяршэння феерверку святочную праграму гала-канцэрта ў Мінску прадоўжылі выступленні зорак беларускай і расійскай эстрады: Дзмітрыя Калдуна, Ірыны Дарафеевай, Руслана Аляхно, Аляксея Гомана, Анжэлікі Агурбаш, Валерыя Лявонцьева і іншых папулярных артыстаў.

Рэспубліканская грамадска-культурная акцыя «За незалежную Беларусь!» праходзіла ва ўсіх абласных і раённых цэнтрах краіны. Пачалася яна 25 сакавіка ў беларускай сталіцы канцэртамі на дзвюх сцэнічных пляцоўках — каля Нацыянальнай бібліятэкі і ў аэрапорце Мінск-1. Арганізатарамі акцыі выступілі Міністэрства культуры, аблвыканкамы, Мінскі гарвыканкам, Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі.

Таццяна ПАЛЯЖАЙ, БЕЛТА.

«СПЯЁМ ГІМН РАЗАМ!»

Фота БЕЛТА.

У Беларусі больш за 1,1 млн чалавек прынялі ўдзел ва ўрачыстасцях з нагоды Дня Незалежнасці

Ва ўрачыстых мерапрыемствах з нагоды Дня Незалежнасці Беларусі прынялі ўдзел больш за 1 млн 126 тыс. чалавек. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміла начальнік управлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Беларусі Кацярына Самусенкава-Шэлегава.

Паводле яе слоў, толькі ў Мінску 3 ліпеня гледачамі параду, удзельнікамі іншых масавых святочных мерапрыемстваў сталі каля 450 тыс. мінчан і гасцей сталіцы.

«МЯСЦОВЫЯ» ІДУЦЬ!

ЗЯМЛЯ І ЛЮДЗІ МІНШЧЫНЫ

У выніку пераходу на дровы затраты змяншаюцца на парадак

Летась у гаспадаркі цэнтральнага рэгіёна былі пастаўлены 216 замежных трактароў, якія здольныя адначасова выконваць шэраг тэхналагічных аперацый. Паводле слоў генеральнага дырэктара прадпрыемства «Мінаблагрэсурс» Уладзіміра Хацяноўскага, гэта дасць магчымасць зэканоміць 15,7 тысячы тон паліва. Будзе праведзена мадэрнізацыя збожжасушыльнай гаспадаркі, дзе ў тым ліку ўстановяць газагенератары на звычайнай саломе. На фермах больш шырока плануюць прымяняць рэкуператары, якія здольныя ўтрымліваць цяпло падчас ахалоджвання малака. Сельскагаспадарчая тэхніка паступова пераводзіцца на спажыванне звадкаванага газу (зразумела, тая, дзе ёсць такая магчымасць). Мяркуецца павялічваць сетку спецыяльных заправак, кожная гаспадарка атрымае ўласны энергетычны «пашпарт». За кошт гэтых і шэрагу іншых мерапрыемстваў у АПК на Міншчыне сёлета будзе зэканомлена 20 тысяч тон паліва, эфект складзе 5,2 мільярда рублёў.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Адно з «балючых» пытанняў — жорсткая «прывязка» да аднаго віду паліва. Трэба тэрмінова шукаць альтэрнатыву газу. Напрыклад, у Швецыі доля «мясцовых» у паліўна-энергетычным балансе за апошнія дзесяць гадоў узрасла з 1 да 18 працэнтаў.

Для патрэб жыллёва-камунальнай гаспадаркі ў цэнтральным рэгіёне зараз у асноўным выкарыстоўваецца прыродны газ, які займае 76 працэнтаў агульнага балансу. На долю мясцовых відаў паліва прыпадае 11,3 працэнта. Для параўнання: у сістэме аховы здароўя гэты паказчык складае 96—98 працэнтаў, адукацыі — 86, а ў сацыяльнай сферы — 58 працэнтаў. Як лічаць спецыялісты Мінскага абласнога ўнітарнага прадпрыемства «Упраўленне жыллёва-камунальнай гаспадаркі», на працягу года ў ЖКГ таксама магчыма змяніць сітуацыю і павялічыць спажыванне «мясцовых». На іх выкарыстанне плануецца «перапрафіляваць» 70 кацельняў. Сёлета спажыванне «блакітнага паліва» камунальнікі Міншчыны плануюць зменшыць на 10 працэнтаў, а мазуту — на 30. Такім чынам удасца часткова кампенсаваць павелічэнне затрат. Рост тарыфаў для насельніцтва будзе максімальна ашчадным.

Як лічаць у абласным упраўленні жыллёва-камунальнай гаспадаркі, жыхары павінны самі клапаціцца аб эканоміі. Напрыклад, устаноўліваць лічыльнікі вады, якіх на Міншчыне ўсяго трэба зманціраваць каля 300 тысяч. На жаль, пакуль людзі не надта актыўна абсталёўваюць сваё жыллё гэтымі прыборамі, асабліва жыхары індывідуальных дамоў. Між тым, для таго, каб устанавіць лічыльнік, можна скарыстацца спецыяльным крэдытам. Такая мера прадугледжвае плуатацыю «лакальную» кацельню, што зноў-такі дазволіць скараціць страты ў сетках.

У Чэрвеньскай ЖКГ створана ўласная спецыяльная брыгада — дзевяць чалавек пастаянна працуюць на нарыхтоўцы дроў. У бліжэйшы час на спажыванне дроў пераводзіцца кацельня ў Натальеўску, яна абагравае 180 кватэр у бліжэйшай вёсцы. Паводле слоў Віктара Гурыновіча, гігакалорыя, якая выпрацавана на мясцовых відах паліва, атрымліваецца больш танная, чым на прыродным газе. Гэта вызначае далейшую перспектыву выкарыстання «мясцовых».

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Чэрвеньскі раён.

ДАВЕДКА Ў ЭЛЕКТРОННЫМ ВАРЫЯНЦЕ

У Беларусі будзе распрацавана агульнарэспубліканская электронная база даных па абмену інфармацыяй паміж рознымі дзяржаўнымі ўстановамі. З'яўленне такой базы дазволіць значна паскорыць атрыманне грамадзянамі краіны даведак і наладзіць дадатковы кантроль за выкананнем зваротаў.

Пяць тысяч. На кожнага

Фрунзенскі раён Мінска можна назваць унікальным, прынамсі, па дзвюх прычынах. Па-першае, дзякуючы шматлікім новабудоўлям, сярэдні ўзрост яго жыхароў складае ўсяго 34,5 года. А па-другое, раён з'яўляецца самым вялікім у краіне. Сёння яго насельніцтва дасягае амаль 350 тыс. чалавек. Калі заўгодна гэта практычна адзін з абласных цэнтраў. Або цэлы дзесятак сярэдніх «сельскагаспадарчых» раёнаў.

— У нас налічваецца каля 2 тыс. ветэранаў вайны, 19,6 тыс. інвалідаў, больш за тысячу шматдзетных сем'яў і адразу 71 тыс. пенсіянераў, з якіх звыш 3 тысяч не маюць дзяцей і працаздольных сваякоў, а яшчэ 10 тысяч — пражываюць адны, — кажа намеснік кіраўніка Адміністрацыі Фрунзенскага раёна сталіцы Георгій Козел. — Нарэшце, у свой час менавіта Фрунзенскі раён стаў адным з месцаў масавага перасялення «чарнобыльцаў». Прычым значнай частцы ўсіх гэтых людзей патрэбна дапамога. І да таго ж не сакрэт: у Мінску жыве больш адукаваных людзей, якія добра ведаюць свае правы. А значыць, тут гатовы нашмат часцей звяртацца ў тыя ці іншыя інстанцыі.

Матэрыяльная дапамога, «гуманітарка», кансультацыі, абслугоўванне на даму, бясплатнае харчаванне, а то і проста гурткі па інтарэсах — усім гэтым займаецца тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Як, зрэшты, і даплатамі ў рамках гарадской праграмы сацыяльнай падтрымкі. Адначасова тут практыкуюць новыя напрамкі. Горад не вёска, дзе сусед ведае суседа, таму зараз у раёне з'явілася новая ідэя — перыядычна абзвоньваць тых жа адзінокіх пенсіянераў. Як кажуць, на ўсякі выпадак.

Вынік? Ён ёсць. Дастаткова сказаць, што за апошні час на сацыяльныя службы сталі менш скардзіцца, а любы падобны прэцэдэнт ужо разглядаецца як «надзвычайнае здарэнне». Праўда, разам з тым аказалася «на паверхні» і адна праблема. Летась на кожнага супрацоўніка тэрытарыяльнага цэнтра прыйшлося амаль... па 5,5 тыс. зваротаў. І кожны з іх — гэта паперы.

— Бяда ў тым, што сёння па сутнасці не наладжаны поўны «закальцаваны» цыкл камп'ютарнай электроннай сувязі, не працуе механізм электроннага дакумента і электроннага подпісу, — працягвае Георгій Козел. — Сапраўды, сёлета адзіную сетку плануецца стварыць у сталіцы, у бліжэйшы час да яе павінны падключыцца адукацыя, міліцыя, ЗАГСы, ужо стаў рэаліяй агульны банк вакансій. Аднак, каб хутка задаволіць просьбу чалавека, гэтага недастаткова. Мінск — яшчэ не ўся Беларусь. Таму для збору звестак аб тым жа перасяленцы з чарнобыльскай зоны нам неабходна рабіць запыты ў Гомельскую, Магілёўскую ці Брэсцкую вобласць. Па пошце ці па факсу. Але ўсім зразумела, што такі варыянт больш працяглы па часе. І да таго ж у параўнанні з электроннай сувяззю — больш дарагі.

Дзе зручна, там і попыт

1 дзень на выдачу даведкі аб памеры пенсіі, аб рэгістрацыі ў якасці беспрацоўнага і пенсійнага пасведчання, 5 рабочых дзён на атрыманне даведак аб перыядзе выплаты і памеры дапамогі на дзяцей, пасведчання аб праве на льготы для ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны, інваліда баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў, пасведчання грамадзяніна, што быў узнагароджаны за самаахвярную працу ў тыле, пасведчання блакадніка Ленінграда, малалетняга вязня, чарнобыльскага ліквідатара, даведкі аб праве на льготы для дзяцей, што атрымліваюць пенсіі па страце карміцеля. Нарэшце, час прадастаўлення дублікатаў пасведчанняў можа складаць ад 1 да 10 дзён. Як адзначаюць у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, гэтыя «рамкі» аказаліся нормай практычна паўсюль. Апроч таго, самі сацыяльныя службы краіны перайшлі на «падоўжаны» рэжым работы. І ў тым ліку — на работу па суботах.

Між тым, высокія хуткасць і дадатковыя зручнасці прывялі да росту зваротаў. Да слова, гэта датычыцца не толькі Фрунзенскага раёна ці горада Мінска. Падобны малюнак назіраецца па краіне ў цэлым. Прычым сітуацыя не зменіцца і надалей — у Беларусі застаюцца высокімі паказчыкі інваліднасці, паступова павялічваецца колькасць пажылога насельніцтва. А плюс да ўсяго, можа значна павялічыцца «папулярнасць» адраснай сацыяльнай дапамогі — у прыватнасці, пасля павелічэння яе памеру з новага года.

— Выйсце ў такіх варунках — набыццё камп'ютарнай тэхнікі і распрацоўка новага праграмнага забеспячэння, — лічыць начальнік галоўнага ўпраўлення комплекснага аналізу і каардынацыі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Яўген Каспяровіч. — Так, гэта каштуе грошай. Аднак як сведчыць вопыт еўрапейскіх краін, нічога іншага не застаецца.

Хочаш хутка? Вывучай... камп'ютар

Распрацоўка дзяржаўнай праграмы «Электронная Беларусь» распачалася летась. Менавіта дзякуючы ёй плануецца «звязаць» розныя дзяржаўныя ўстановы. І стварыць агульную базу даных для абмену інфармацыяй пасля звароту грамадзян.

— У выніку для вырашэння сваёй праблемы кожны чалавек зможа звяртацца толькі ў адно месца, — лічыць адзін з распрацоўшчыкаў праграмы, вядучы інжынер кампаніі «Белсофт» Міхаіл Лугавіер. — І да таго ж праграма забяспечыць ці не галоўнае — хуткую і якасную работу з любым зваротам.

Пакуль дзяржаўная праграма «Электронная Беларусь» знаходзіцца на стадыі тэхнічнага праектавання. Аднак, як чакаецца, ужо да канца снежня да агульнай базы змогуць падключыцца некалькі міністэрстваў. А да канца наступнага года праграма аб'яднае практычна ўсе службы. Прычым, заўважае Міхаіл Лугавіер, у будучым магчымасць карыстацца ёй атрымаюць не толькі супрацоўнікі ўстаноў, але і звычайныя грамадзяне. Апошнія змогуць накіроўваць свае звароты напрамую — праз інфакіёскі або хатні Інтэрнэт.

Сяргей ГРЫБ.

Рэканструкцыя будынка тэатра оперы і балета — да снежня 2008 года

Такое даручэнне даў прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі на нарадзе аб ходзе работ па рэканструкцыі будынка тэатра оперы і балета.

Ён даручыў перагледзець тэрміны правядзення рэканструкцыі ў бок скарачэння.

Да 1 верасня гэтага года інстытут «Белдзяржпраект» павінен падрыхтаваць дызайн-праект усяго аб'екта. У прыватнасці, зона для гледачоў комплексу прадугледжвае роспіс столі ў зале, заслоны. Для глядзельнай залы опернага тэатра плануецца распрацаваць эксклюзіўныя крэслы. «У тэатры оперы і балета Беларусі ўсё павінна быць зроблена лепш, чым у еўрапейскіх тэатрах. Арганізуйце камандзіроўкі ў Гранд-апера і ў Ла Скала, паглядзіце, як зроблена там», — сказаў прэм'ер-міністр. Сяргей Сідорскі даручыў таксама павялічыць колькасць працуючых на аб'екце да 500—600 чалавек і зрабіць больш таннымі частку работ.

Жанна КАТЛЯРОВА, БЕЛТА.

Прэзідэнт павіншаваў

Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла Уго Рафаэля Чавеса Фрыяса з Днём абвяшчэння незалежнасці гэтай краіны.

Прэзідэнт Беларусі пацвердзіў намер нашай краіны да развіцця канструктыўнага ўзаемадзеяння з Венесуэлай у рамках ААН, Руху недалучэння і іншых міжнародных арганізацый.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў дынаміку ў рэалізацыі двухбаковых праектаў супрацоўніцтва ў гандлёва-эканамічнай, навукова-тэхнічнай, ваенна-тэхнічнай і іншых галінах. Беларускі лідар лічыць, што актывізацыя ўсяго комплексу беларуска-венесуэльскіх адносінаў адпавядае стратэгічным інтарэсам дзвюх дзяржаў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ДА КАНЦА ГЭТАГА ТЫДНЯ НАДВОР'Е Ў БЕЛАРУСІ БУДЗЕ ДАЖДЖЛІВАЕ

паведаміла галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга Фядотава.

У чацвер, 5 ліпеня, ноччу на паўночным захадзе краіны, а днём на большай частцы тэрыторыі чакаюцца моцныя дажджы. Не абыдзецца без ападкаў, месцамі даволі моцных, і 6—7 ліпеня. У будучыя тры дні месцамі чакаецца ўзмацненне ветру да 15—20 метраў у секунду, адзначыла спецыяліст. Тэмпература паветра ў ноч на 5 ліпеня складзе 12—17 градусаў цяпла, днём яна павысіцца да 15—20 градусаў, на ўсходзе краіны да 26 градусаў. У пятніцу, 6 ліпеня, у начныя гадзіны будзе крыху халадней — 10—15 градусаў цяпла, днём — ад 15 да 21 градуса вышэй за нуль. Да нядзелі тэмпературны фон істотна не зменіцца. На большай тэрыторыі краіны пройдуць дажджы, у асобных раёнах яны будуць суправаджацца навальнічамі. У пачатку наступнага тыдня, 9 ліпеня, дажджы пройдуць на паўночным усходзе рэспублікі. На большай тэрыторыі Беларусі надвор'е палепшыцца. Днём чакаецца 16—22 градусы цяпла. У Брэсцкай вобласці будзе 20—25 градусаў вышэй за нуль.

БЕЛТА.

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 5.07.2007 г. (для б/н разлікаў)	
1 долар ЗША	2 145,00
1 еўра	2 920,31
1 латвійскі лат	4 193,14
1 літоўскі літ	845,25
1 чэшская крона	101,72
1 польскі злоты	776,51
1 расійскі рубель	83,58
1 украінская грыўня	427,12

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў	
Цэнтрабанк РФ	
USD	25,6629
10 UAH	50,8549
1000 BYR	11,9418
EUR	34,9657
Курс у гандлёвых кампаніях (на 29.06.2007 г.)	
USD	2140 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падтыкацца на часопіс «Главный Бухгалтер». Гэта самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО

БЕЛВНЕШЭКОНОМБАНК

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «БЕЛВНЕШЭКОНОМБАНК»,

расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32, сообщает о проведении 13 июля 2007 г. Общего собрания акционеров в заочной форме.

ПОВЕСТКА ДНЯ ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

1. О внесении в Устав ОАО «Белвнешэкономбанк» изменений и дополнений.
2. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Борисовскому районному исполнительному комитету.
3. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Глубокскому районному исполнительному комитету.

Список лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, составлен на основании данных реестра владельцев акций ОАО «Белвнешэкономбанк», сформированного на 25 июня 2007 года.

Лица, имеющие право на участие в Общем собрании акционеров, могут ознакомиться с решением о проведении Общего собрания акционеров ОАО «Белвнешэкономбанк» в заочной форме, проектом устава ОАО «Белвнешэкономбанк» в новой редакции, другой необходимой информацией и заполнить бюллетени для заочного голосования ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, с 9.00 до 13.00 в течение семи дней со дня опубликования данного сообщения включительно по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, 6, ком. 707, а также в филиалах ОАО «Белвнешэкономбанк».

Заполненные бюллетени для заочного голосования должны быть представлены в ОАО «Белвнешэкономбанк» не позднее 11 июля 2007 г. по адресу: Республика Беларусь, 220073, г. Минск, ул. Скрыганова, 6, ком. 707, почтой, нарочным либо по факсу (8-017) 209-25-48 с обязательной доставкой (досылкой) оригинала бюллетеня.

Дополнительная информация по телефонам: (8-017) 209-24-21, 209-25-40.

Мікалай ЗАЙЧАНКА:

«Узровень інфляцыі сёлета не будзе перавышаць 8 працэнтаў»

Аб гэтым паведаміў міністр эканомікі Беларусі Мікалай Зайчанка на прэс-канферэнцыі, прысвечанай Дню эканаміста.

Міністр адзначыў, што летась інфляцыя была 6,6 працэнта. У чэрвені інфляцыя была вельмі маленькай, не больш за 0,1—0,2 працэнта, а ў жніўні спецыялісты Мінэканомікі чакаюць нават невялікую дэфляцыю, калі традыцыйна зніжаюцца цэны на сезонныя харчовыя прадукты.

Паводле слоў міністра эканомікі, сёння ў краіне выконваюцца амаль усе галоўныя макраэканамічныя паказчыкі. Аднак застаецца складанай сітуацыя па знешняму гандлю. Так, паводле апошняй інфармацыі, краіна мае з пачатку года адмоўнае знешнегандлёвае сальда на ўзроўні 1 млрд 162 мільёны долараў. У сувязі з дагаворнымі цяжкасцямі ў пачатку года з расійскімі пастаўшчыкамі энерганосьбітаў, за 4 месяцы сёлета краіна не атрымала 430 млн USD па экспарту беларускай нафты і нафтапрадуктаў. Паралельна з павелічэннем кошту газу і нафты будзе ісці рост аб'ёмаў энергетычнага імпарту. На думку Мікалая Зайчанкі, нам трэба скарачаць іншы неінвестыцыйны імпарт. Забараняць спажывецкі імпарт агулам сёння ніхто не збіраецца. Зараз будзе ісці пошук цывілізаваных рычагоў і механізмаў, якія паспрыяюць скарачэнню аб'ёмаў такога імпарту, адзначыў Мікалай Зайчанка.

Сяргей КУРКАЧ.

ISSN 1990 - 763X

БПС БАНК

БЕЛПРОМСТРОЙБАНК

ОАО «БПС-Банк» устанавливает с 5 июля 2007 г. следующие процентные ставки по вновь привлекаемым депозитам физических лиц в иностранной валюте:

1. Срочный банковский депозит на 4 месяца в иностранной валюте «К отпуску»

Срок привлечения	Сумма депозита, дополнительного взноса	Процентная ставка (годовая) Доллары США, евро
4 месяца	любая	6

2.Срочный банковский депозит в иностранной валюте «Дифференцированный доход»

Срок привлечения	Сумма депозита	Шкала процентных ставок (годовых) Доллары США, евро					
6 месяцев	любая	за 1-й	за 2-й	за 3-й	за 4-й	за 5-й	за 6-й
		3	4	5	7	9	11

3. Срочный банковский накопительный депозит с капитализацией в иностранной валюте

Срок привлечения	Сумма депозита, дополнительного взноса	Процентная ставка (годовая)	
		Доллары США, евро	Российские рубли
3 месяца	любая	4	5
6 месяцев		6	6
1 год		8	8
2 года		9	8,5
3 года		9,5	9

шкала процентных ставок при досрочном востребовании депозита

Период размещения до даты востребования	Процентная ставка (годовая)	
	Доллары США, евро	Российские рубли
до 3 месяцев	ставка текущих счетов физических лиц*	ставка текущих счетов физических лиц*
от 3 месяцев до 6 месяцев	3	4
от 6 месяцев до 1 года	5	5
от 1 года до 2 лет	7	6,5
от 2 лет	8,5	8

4. Срочный банковский депозит на 1 год в иностранной валюте «Динамичный»

Срок привлечения	Сумма депозита, дополнительного взноса	Процентная ставка (годовая)	
		Доллары США, евро	Российские рубли
1 год	любая	8	8

Дополнительную информацию можно получить в любом учреждении ОАО «БПС-Банк» или по телефону в г. Минске 289-46-06.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 13.02.2007 года на осуществление банковской деятельности.

Полную сохранность средств физических лиц в иностранной валюте в ОАО «БПС-Банк» гарантирует государство.

БЕЛАРУСБАНК 1922-2007 85 ЛЕТ

с 9 июля 2007 года

НОВЫЙ ВКЛАД в белорусских рублях "Удобный плюс"

УДОБНО И ПРОСТО!

- Вклад может быть открыт на имя другого лица.
- Автоматическое переоформление на новый срок, аналогичный первоначальному. Указанное правило действует один раз.
- По истечении двух сроков хранения производится переоформление на новый вклад "ЮБИЛЯР"

Вносится наличными и безналичными денежными средствами

Срок хранения вклада — 25 календарных дней

Фиксированная ставка — 12% годовых

Минимальная сумма вклада — 100 000 белорусских рублей

Сохранность и возврат вкладов в АСБ «Беларусбанк» гарантируются в порядке, установленном законодательством РБ.

www.belarusbank.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка РБ № 1 от 27.10.2006г.

Пра «базар»: усе падрабязнасці

Што датычыцца рэалізацыі білетаў. На канцэрт адкрыцця фестывалю іх даўно ўжо прадалі. На тэатральныя пастаноўкі білеты можна купіць, як кажуць, па вялікаму знаёмству. Ды і наогул не на самыя лепшыя месцы. Чарга ля білетных кас — добрая прыкмета новага фестывалю.

Больш за 1500 супрацоўнікаў міліцыі і ваеннаслужачых унутраных войскаў з розных рэгіёнаў Беларусі будуць ахоўваць парадак на чарговым фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Сярод іх будуць і міліцыянеры ў цывільным. Гэта ў 2,5 раза больш, чым у звычайныя дні. Каб сачыць за абстаноўкай на вуліцах, будуць працаваць больш за 100 відэакамер назірання.

Аўтобус выцвярэзніка будзе ездзіць па горадзе з прафілактычнымі надпісамі «Медвыцвярэзнік акажа Вам паслугі. Кошт паслуг 77 000 рублёў. Але падумайце, ці неабходна Вам гэта?». Такім чынам, міліцыянеры спадзяюцца, што грамадзяне будуць абачлівымі. Дарэчы, як і летась, продаж алкагольнай прадукцыі ў межах 500 метраў ад плошчы Свабоды — цэнтра фестывальных падзей — будзе пад забаронай.

Бяздомных на час «базару» ізалююць у спецыяльныя прыёмнікі. Дарэчы, прапанова карэспандэнта «Звязды» выдаваць пашпарты гэтым грамадзянам будзе разгледжана кіраўніцтвам УУС Віцебскага аблвыканкама. А пытанне было зададзена ў сувязі з тым, што прама на вуліцах фестывальнага горада супрацоўнікі пашпартнай службы будуць рэгістраваць грамадзян іншых краін, якія будуць знаходзіцца ў нас больш за 3 дні і пражываць не ў гатэлях, а ў сяброў, знаёмых і г.д. Між іншым, каб іншаземцам было прасцей, у РАУС будуць дзяжурыць разам з міліцыянерамі перакладчыкі. А пагранічнікі прадэманструюць ступені абароны галоўнага дакумента на спецыяльных прыборах. Каб даказаць, што несапраўдны пашпарт — бяда для яго ўладальніка.

ДАІ рыхтуе сюрпрызы. Пад адкрытым небам прымуць экзамены ў матацыклістаў, дадуць кансультацыі наконт новых правілаў дарожнага руху, пытанняў павышэння катэгорыі і г.д. Верталёт ДАІ будзе аблятаць фестывальны горад. ДАІ актыўна выкарыстае спецыяльныя прыборы назірання за дарогамі з фіксацыяй фактаў парушэнняў. Цікава, што міліцыянеры будуць і весяліць грамадзян. Так званых няпростых (цяжкіх) падлеткаў, каб яны не бавілі час бескантрольна, адправілі ў лагеры пры падраздзяленнях міліцыі. Але ж, каб не пазбавіць магчымасці ўбачыць «базар», арганізавана прывязуць, пакажуць усё самае цікавае. Добра, што супрацоўнікі па справах непаўналетніх вызваляюцца ад нагрузкі сачыць за парадкам падчас фестывальных мерапрыемстваў нароўні з калегамі з іншых падраздзяленняў міліцыі, а будуць займацца канкрэтна сваёй справай.

Харчаванне гасцей базару плануюць арганізаваць у 32 рэстаранах, кафэ, сталовых. Усяго ў фестывалі бяруць удзел каля 6000 удзельнікаў і гасцей. Жыць, дарэчы, госці будуць не толькі ў абласным цэнтры: гатэлях, ды інтэрнатах, якіх заўсёды ў «базарныя» дні не хапае, але і ў Віцебскім і Гарадоцкім раёнах. Для найбольш важных асобаў прадстаўлены прэстыжны загарадны комплекс «Крупеніна». Ёсць інфармацыя, што там пераначуе сама Патрысія Каас. У гатэлях, дзе пабываў наш карэспандэнт, паабяцалі, што кандыцыянеры сёлета працаваць будуць. А летась з гэтым нюансам была праблема, а спякота стаяла такая, што...

Уваходы ў амфітэатр абсталяваны спецыяльнымі рамкамі, як у аэрапортах. Наогул, пытанням забеспячэння бяспекі надаецца зараз самая вялікая ўвага. Каб ніхто з гледачоў не закрануў у амфітэатры правады тэлевізійнікаў, яны пракладзены па спецыяльных падземных камунікацыях.

Так што, спадзяёмся, на «базары» будзе ўсё спакойна!

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

АЎТАЛАЎКА ПРЫЯЗДЖАЛА



Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

Жыхары вёскі Садкі Ушацкага раёна Ядзвіга МАЛАШОНАК з унучкай Настассяй.

ВАДЫ МНОГА — ГРОШАЙ МАЛА

Сустрэцца з Мікалаем Дамарадам вырашыў пасля інфармацыі ў раёнцы. «У тым, што на карце раёна з'явіўся аграгарадок Гарадзішча, ёсць і заслуга Баранавіцкага прадпрыемства меліярацыйных сістэм. Але, выканаўшы немалы аб'ём работы па добраўпарадкаванню, работнікі прадпрыемства пакуль не дачакаліся аплаты за сваю працу — ім павінны 130 мільёнаў рублёў...», — паведамляў «Бягучы радок». Падумалася: а як выжывае ПМС у такіх умовах?

Мікалай Дамарад узначальвае сваё прадпрыемства ўжо два дзесяткі гадоў і ў гэтым плане ён адзін са старажылаў раёна.

Гаварыць пра нявыплачаныя грошы Мікалай Андрэевіч адмовіўся, бо, як мне падумалася, уся прычына ў тым, што тыя мільёны «вісяць» на райвыканкаме. А на раённае начальства скардзіцца не выходзіць.

Сёння прадпрыемства не толькі падтрымлівае ў парадку меліярацыйную сістэму раёна (а гэта 787 кіламетраў водных каналаў ды больш за 19 тысяч гектараў асушаных зямель), але і выконвае заказы, якія да меліярацыі ніякіх адносінаў не маюць — жыццё прымушае.

Напрыклад, на 2007 год адпушчана 1330 мільёнаў рублёў, а каб прадпрыемства нармальна развівалася, неабходна мець не меней як два мільярды. Вось і даводзіцца брацца за любую работу: разбіраць старыя будынкі, узводзіць навесы, займацца сянажнымі ямамі, рамонтам і будаўніцтвам дарог, водазабеспячэннем ... і шукаць заказы за межамі свайго раёна. Вядзецца работа ў Карэліцкім, ёсць планы на Іў'е, і там ужо іншы падыход, чым дома. Перад выкананнем заказу бярэцца 50 працэнтаў авансу і гэта дае магчымасць адчуваць сябе больш-менш упэўнена.

А лепш за ўсё, калі заказчык мае грошы і тады няма праблем. Напрыклад, прадпрыемства ачысціла сажалку ў Паўлінаве пад Баранавічамі і работу аплацію «Атлант», але ж такі заказчык бывае не кожны дзень.

З Мікалаем Дамарадам размова адбылася на лузе каля меліярацыйнага канала. Ён ехаў у Мінск на нараду і баяўся спазніцца. І на апошняе пытанне, што для яго сёння самае важнае, адказаў: «Самае галоўнае — захаваць прадпрыемства, каб яно нягледзячы на ўсе пературбацыі выжыла».

І ад сябе. Аграгарадкі яшчэ неабходна ўзвесці ў Гірмантаўцах, Вольне, Карчаве, і тут неабходна зыходзіць з рэальнага стану справы. А ўсё вельмі проста. Ёсць грошы — робім заказ, над якім прадпрыемства будзе працаваць. Няма фінансаў, то навошта, уключыўшы адміністрацыйны рэсурс, рабіць ціск на прадпрыемства?

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Звязда-90: адваротны адлік

Да юбілею «Звязды» засталося **35 дзён**

Арыгінальнасць заўсёды прыцягвае

Прэзентацыі «Звязды» на Віцебшчыне часта нагадвалі сапраўднае шоў: байкеры каталі на сваіх магутных матацыклах тых, хто падпісаўся на газету, юныя мастакі з балончыкамі ў руках стваралі пад «звяздоўскім» брэндам свае вулічныя экспрэс-шэдэўры.... Шмат чаго было. Паштавікі нават параілі нам паралельна займацца арганізацыяй відовішчаў. Многія нашы чытачы і паштовыя работнікі і зараз з задавальненнем успамінаюць фокусы, якія паказваў на галоўным віцебскім паштамце **маг і чарадзей Сяргей ФЕЛЬДМАН.** Ён — артыст арыгінальнага жанру, якіх адзінкі ў Беларусі. Яго чарговая ўнікальная праграма, цяпер ужо з мыльнымі бурбалкамі, якую ён дэманструе разам з партнёршай — жонкай Таццянай, наогул аналагаў не мае! Вось як фокуснік арыгінальна павіншаваў нас усіх з юбілеем «Звязды»: усяго за некалькі хвілін зрабіў са свежага нумара елачку, ды падчас гэтага магічнага працэсу выказаў свае шчырыя словы:

— Мне было вельмі прыемна, калі звяздоўцы некалькі гадоў таму запрасілі мяне выступіць у памяшканні паштовага аддзялення, і такім чынам падтрымаць газету. У кожнага фокусніка ёсць маса фокусаў з газетамі, і ў мяне таксама. Я люблю працаваць на сцэне з газетамі. І проста здорава, калі я дапамог «Звяздзе» ў правядзенні яе рэкламнай акцыі.

Канешне, першыя 90 гадоў цяжка, а ў наступныя 90 будзе лягчэй!... А калі без жарту, тое, што газета «Звязда» перажыла розныя палітычныя змены, была патрэбная і ў савецкі час, у гады перамен, і цяпер, як і раней, цікавіць чытачоў, толькі пацвярджае, што «Звязда» заўсёды запатрабаваная. Жадаю яшчэ больш арыгінальных матэрыялаў, больш цудоўных тэм. Калі звяздоўцы запросяць на святкаванне юбілею старэйшай газеты рэспублікі, мы з Таццянай з задавальненнем прыедзем і пастараемся здзівіць рэдакцыю і чытачоў. Верце ў цуды і рабіце іх самі для сваіх родных, любімых і блізкіх людзей!

Сведкай сапраўднага газетнага цуду стаў Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Фота аўтара.

Ёсць пытанне

Лішняга — не трэба

Ведаю пра цудоўныя лекавыя ўласцівасці шабельніка. А вось саму гэтую расліну розныя траўнікі апісваюць па-рознаму. Падкажыце, які з шабельнікаў самы «правільны», самы надзейны ў лячэнні хвароб.

М.А. Валынец,
в. Шылавічы Вілейскі раён.

Розныя адценні ў колеры кветак і лісця могуць тлумачыцца ўмовамі, у якіх расце кустоўе, аднак лекавыя ўласцівасці ад гэтага не залежаць.

У народзе шабельнік называюць яшчэ дэкопам, пяціперснай травой, растапыркай. Расце ён у забалочаных лясах, уздоўж канаў, па берагах лясных азёраў, па сырых берагах рэк. Корань доўгі, паўзучы. Лісце знізу шызаватае, па краях вострапільчатае, падобнае на растапыраныя пальцы рук. Кветачкі крывава-чырвоныя, з пяццю пялёсткамі. Цвіце ў чэрвені—ліпені.

Збіраюць цвітучыя верхавінкі даўжынёй 25—30 см летам, карані — вясной або восенню.

Прымяняюць у народнай медыцыне пры лячэнні гіпертаніі, атэрасклерозу, прастудных і страўнікава-кішачных захворванняў, парушанага абмену рэчываў (дыябету, валляка, атлусцення), туберкулёзу (лёгкіх, касцей, скуры), а таксама радыкуліту, рэўматызму, падагры і розных пухлін. Расліна праславіла сябе тым, што як шабляй «адсякае» і ачышчае ад усяго лішняга (пухлін, тлушчакоў, соляў, камянёў і г.д.).

Адвар. Заліваюць 1 ст. лыжку каранёў 200 мл кіпеню, вараць 20 хвілін, настойваюць 2 гадзіны. Прымаюць па 1 ст. лыжцы 3 разы на дзень за 20—30 хвілін да яды. Курс лячэння — 4—6 тыдняў.

Настой. Заліваюць 1 ст. лыжку лісця і кветачак 200 мл кіпеню на 1 гадзіну. П'юць па 1/4 шклянкі 3 разы на дзень.

Настойка. Заліваюць 1 шклянку здробненага карэння 0,5 л гаролкі на 3 тыдні. Прымаюць па 1—2 ч. лыжкі 3 разы на дзень за 20 хвілін да яды.

Мазь. Заліваюць 1 шклянку кветак і лісця 300 мл (40 °С) алею на 2 тыдні, адціскаюць.

Лідзія НАВІЧЫХІНА,
лекар-травазнаўца.

Як нас дураць

Аднойчы вечарам, нападпітку...

Становішча са злачынствамі, што датычацца мабільных тэлефонаў, працягвае абвастрацца.

Паводле інфармацыі аддзела па раскрыццю злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій УУС Гродзенскага аблвыканкама, калі ў 2005 годзе са сваімі законнымі гаспадарамі «развіталіся» 2123 «мабільнікі» (і гэта толькі па афіцыйных звестках), то летась у вобласці па фактах злачынных замахаў на мабільныя тэлефоны было ўзбуджана 2700 крымінальных спраў. Сярод злачынных прыёмаў пераважаюць крадзяжы (каля 80 працэнтаў). Як сведчыць практыка, найбольшыя шанцы расстацца са сваім «мабільнікам» у чалавека, які спачатку выпе, затым пойдзе на дыскатэку альбо ў рэстаран, пакіне тэлефон на століку, калі пойдзе пакурыць, а познім вечарам па дарозе дамоў паверыць просьбе выпадковага прахожага пазычыць яму на хвіліну тэлефон, каб пазваніць любімай бабулі.

Што рабіць, калі тэлефон згублены альбо ўкрадзены? У аддзеле па раскрыццю злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій УУС Гродзенскага аблвыканкама раяць перш за ўсё заблакіраваць выходныя званкі, пазваніўшы ў аддзел абслугоўвання вашага аператара. Калі ж вы заблакіравалі выходныя званкі не адразу, то вазьміце дэталізацыю, каб даведацца, ці званілі і куды з вашага тэлефона. Паспрабуйце таксама пазваніць на свой тэлефон, магчыма яго проста вернуць за ўзнагароджанне. І, канешне, трэба знайсці магчымасць неадкладна паведаміць аб здарэнні ў міліцыю і пастарацца правільна апісаць прыкметы зламысніка.

Нажыць праблему вы рызыкуеце і ...набыўшы тэлефон з рук. Трубка можа аказацца крадзенай альбо працаздольнай толькі на кароткі тэрмін. Таму пры пакупцы варта звярнуць увагу на камплектнасць: ці родныя акумулятар і зараднае ўстройства, ці ёсць дакументы? Калі вас у гэтым не пераканалі, то не выключана нейкая крымінальная падаплёка.

Па адрасу www.onliner.by/imei/index.php у Інтэрнэце размешчаны так званы Blacklist, альбо база даных згубленых ці ўкрадзеных тэлефонаў. Тут можна праверыць IMEI «мабільніка», каб пераканацца, што трубка не значыцца сярод крадзеных і ніхто не зможа прад'явіць свае правы на яе ў будучым. У выпадку, калі тэлефон згублены альбо ўкрадзены, пазначце нумар IMEI свайго тэлефона (ён знаходзіцца на каробцы ці ў гарантыйным талоне) у гэтай базе. Магчыма, праз нейкі час ён недзе «ўсплыве». Веданне IMEI «мабільніка» істотна дапаможа і праваахоўным органам у яго вышуку.

І яшчэ адна парада. Раскажыце сваім дзецям, як не трэба весці сябе на вуліцы альбо ў гасцях, каб захаваць тэлефон. А таксама, канешне, адпаведныя нормы не ігнаруйце і самі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Размаўляйце. Не шкадуйце...

Мясцовая тэлефонная сувязь у Беларусі — адна з самых танных на постсавецкай прасторы.

Як паведамілі журналісту «Звязды» ў рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Белтэлекам», тэлефоны стацыянарнай тэлефоннай сеткі маюць у нашай краіне пахвілінную тарыфікацыю 8,05 рубля за адну хвіліну і штомесячную абаненцкую плату, якая складае 1660 беларускіх рублёў. Для параўнання, у Расіі абаненцкая плата ў перараразліку на беларускія рублі складае 10.315 рублёў. Ва Украіне і Эстоніі — амаль што 9 тысяч, пры гэтым у Эстоніі за кожную хвіліну тэлефонных размоў трэба выкласці 52,9 рубля. Жыхары Казахстана штомесяц плацяць за тэлефон 8941 рубель. У Малдове абаненцкая плата складае 4222 рублі плюс 16,8 рубля трэба заплаціць за кожную хвіліну мясцовых перамоў. У Латвіі няма фіксаванай абаненцкай платы за тэлефонную сувязь, аднак кожная хвіліна тэлефонных размоў ацэньваецца ў 96,7 рубля.

Міжгародняя сувязь у Беларусі прадастаўляецца таксама па больш нізкіх цэнах: 20 рублёў за хвіліну размоў у межах вобласці і 41 рубель — у межах краіны. У Расіі міжгароднія перамовы каштуюць ад 196 да 354 рублёў за хвіліну, у Малдове — 74 рублі незалежна ад месцазнаходжання населенага пункта, у Латвіі — 291, ва Украіне — ад 205 да 256 рублёў за хвіліну размоў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Камунальны крымінал

Дзве крымінальныя справы былі ўзбуджаны пасля праверкі дзяржкантролем КУП «Райжылфонд» Аршанскага раёна. Аб гэтым паведаміў «Звяздзе» намеснік старшыні Камітэта дзяржкантролю Беларусі — дырэктар Дэпартамента фінансавых расследаванняў Сяргей Бараноўскі. У гэтым раёне шмат жылля, якому даўно патрэбны рамонт. У ліку іншага былі выяўлены парушэнні пры выкарыстанні бюджэтных сродкаў, вылучаных на капітальны рамонт жылога фонду.

Спецыялісты Аршанскага міжраённага камітэта дзяржаўнага кантролю высветлілі, што, нягледзячы на стратную работу, толькі летась у памеры 320 мільёнаў рублёў (у 2005-м — 672 мільёны), быў куплены службовы аўтамабіль для дырэктара коштам 37 мільёнаў рублёў. Паводле звестак на студзень 2007-га, у ліку пачатых і не завершаных капітальным рамонтам былі 5 жылых дамоў, нарматыўныя тэрміны рамонту якіх перавышалі ад 4 да 17 разоў. Акрамя гэтага 2 дамы, якія было запланавана капітальна адрамантаваць у 2005 і 2006 гадах, так і засталіся без рамонту.

Як устанавілі кантралёры, дырэктар і галоўны бухгалтар прадпрыемства не забяспечылі паступленне на асобны рахунак у поўным аб'ёме налічаных насельніцтву плацяжоў, прадугледжаных на капітальны рамонт жылога фонду (у 2005-м трапіла толькі 44 працэнты ад налічаных, у 2006-м — 52 працэнты).

А пры гэтым грамадзянамі толькі летась былі накіраваны 164 звароты па пытаннях капрамонту жылля, кожная восьмая скарга — па праблеме рамонту даху. Адзначалі людзі і няякаснае выкананне ўжо праведзеных работ.

Высветлілася, што з вялікімі парушэннямі ажыццяўлялася эксплуатацыя кацельняў. Зафіксаваны высокі ўзровень страт цеплавой энергіі, што склала 38 працэнтаў (альбо 113 мільёнаў рублёў!). Па асобных кацельнях штомесячныя страты цеплавой энергіі складалі да 75 працэнтаў ад аб'ёму яе выпрацоўкі. Адна з прычын вялікіх страт цеплаэнергіі — высокая ступень зносу цеплавых сетак (ад 80 да 100 працэнтаў) і іх нездавальняючы стан. Выдадзеныя прадпрыемству летась бюджэтныя грошы на капітальны рамонт крыніц цеплазабеспячэння, а ўсяго гэта 1,2 мільярда рублёў, як высветлілася, былі выкарыстаны неэфектыўна. У казначэйства былі прадстаўлены фальсіфікаваныя дакументы, і ў выніку «Райжылфонд» незаконна атрымаў бюджэтныя грошы ў памеры 178,7 мільёна рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Оршы — аўтавакзал, Лядовы палац-трансформер...

Оршы споўнілася 940 гадоў!

У дзень нараджэння Оршу з юбілеем павіншавалі кіраўнікі ўладаў Вязьмы (Расія) і Мінска-Мазавецкага (Польшча). Выступілі ў горадзе — юбіляры ВІА «Сіняя птушка», «Арыель», ансамбль «Сябры»... Працаваў «Горад майстроў», выступілі фальклорныя калектывы, адкрыліся выставы, арганізавана было гістарычна-тэатральнае прадстаўленне.

Ідуць вялікія работы па рамонту гарадскіх аб'ектаў. У прыватнасці, рамантуюцца тры масты: праз Днепр (капітальны рамонт), праз раку Аршыца. Будуецца новы аўтавакзал, побач з чыгуначным. Працягваецца рэканструкцыя аршанскага радзільнага дома. Гэтая медыцынская ўстанова будзе працаваць не толькі на Оршу, а таксама на Аршанскі, Талачынскі, Дубровенскі раёны. Ад старога будынка засталіся толькі сцены, а ўсё астатняе — новае! Медыцынскае абсталяванне будзе адпавядаць лепшым еўрапейскім стандартам. Да канца гэтага года плануецца завяршыць рэканструкцыю старэйшай навучальнай установы горада — СШ № 1. Летась гэтаму будынку і школе споўнілася 100 гадоў!..

Сёлета ў Оршы здадзены ў эксплуатацыю тры новыя аперацыйныя блокі бальніцы. І днямі завяршыла сваю работу камісія па прыёмцы рэканструяванага аб'екта: у бальніцы, дзе будзе размешчаны яшчэ адзін рэанімацыйны блок і новае аперацыйнае аддзяленне. Рэканструюецца і спартыўны комплекс...

Паводле слоў старшыні аршанскага гарвыканкама Валерыя Шабадалава, плануюцца вялікія работы па абнаўленню цепласетак. І на гэтыя мэты выдзяляюцца значныя сродкі. Вуліцы трэба добраўпарадкоўваць, асфальтаваць.

У Оршы ў наступным годзе завершыцца рэканструкцыя плошчы Леніна. Зменіць сваё аблічча гарадскі Парк культуры і адпачынку. Тут запланавалі пабудаваць канцэртны амфітэатр. Канешне, будуць прывезены ў парадак і суседнія тэрыторыі. Ля палаца льнокамбіната і ДК чыгуначнікаў таксама арганізуюць канцэртныя пляцоўкі.

Аршанцы ганарацца тым, што сёлета пачынаецца будаўніцтва спартыўна-забаўляльнага комплексу на 5 тысяч гледачоў, дзе можна будзе праводзіць міжнародныя хакейныя спаборніцтвы. У гэтым Лядовым палацы, акрамя лядовай арэны, змесціцца пляцоўка для боўлінга, а таксама адкрыюцца кафэ, бар, фітнэс-цэнтр, дзіцячы комплекс, памяшканне для заняткаў лядовай харэаграфіяй. Прадугледжана яшчэ адна лядовая пляцоўка для дзяцей і фігурыстаў. Гэты комплекс будзе трансфармавацца для правядзення культурных мерапрыемстваў. На лёдзе можна будзе ўстанаўліваць дадатковыя месцы і праводзіць розныя канцэрты.

Старшыня гарвыканкама і яго каманда спадзяюцца, што ўсё гэта стане штуршком для новага развіцця горада.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Орша—Віцебск

Простыя рэчы

РОВАР

Фота Анатоля КЛЯШЧУКА.

Гэта слова многім з беларусаў, магчыма, будзе і малазнаёмым ці зусім незнаёмым. А азначае яно простую рэч — веласіпед. Хоць у нашых мясцінах менавіта роварам называюць гэтую рэч. Гэта, зразумела, ад польскага, бо да 1939-га Заходняя Беларусь знаходзілася ва ўладанні польскай дзяржавы, а там існаваў «ровэж». Прычым у той дзяржаве ровар меў немалое значэнне. Былі нават спецыяльныя веласіпедныя вайсковыя падраздзяленні. Як успамінаюць старыя людзі, менавіта на роварах прыязджалі ў вёскі польскія паліцыянты. Былі і фурманкі, але ровар пераважаў. І вось убачыць селянін здалёк, што да вёскі набліжаюцца пару «ровэжаў» — адразу нацянькі. А ў яго комін не пабелены — аштрафуюць. А ў каго ў лазенцы кацёл бурболіць, самагоначка цячэ — таксама трэба затушыць агонь, перахаваць, бо знойдуць: штраф зусім немалы, а то і ў пастарунак, на адсідку. Потым пачалі паліцыянты на «ровэжах» шукаць па вёсках і лісткі, якія падкідвалі сябры Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. Пра гэта таксама ўжо забыта. А між тым наш народны Максім Танк прымаў непасрэдны ўдзел у гэтай дзейнасці. У яго таксама быў ровар, бо быў ён з даволі заможнай сялянскай сям'і. Пагартайце яго ўспаміны.

Калі ж з'явіўся ровар? Само слова ідзе ад англійскага «rower». Так што ці не жыхары туманнага Альбіёна яго вынаходнікі? Недзе чытаў, што адным з вынаходстваў чалавецтва, якія дазволілі яму шпарчэй рухацца да новага жыцця, было кола. Відаць, сапраўды так. А кола да ровара мае самае непасрэднае дачыненне. Два колы, рама, сядзенне ды руль, яшчэ педалі і ланцуговая перадача — самы класічны ровар. У кінахроніках пачатку XX стагоддзя можна пабачыць вельмі цікавыя першасныя ровары: з вялікімі і зусім маленькімі коламі, з сядзеннямі, якія высока ўзнесены над зямлёй. Былі яны і трохколавымі, і чатырохколавымі. Але паступова ровар набыў той выгляд і тую аздобу, якая стала найбольш рацыянальнай. Паглядзіце тэлевізар: ровар у нас, у В'етнаме ці Кітаі, у Еўропе мае аднолькавы знешні выгляд. Магчыма, ёсць нейкія адрозненні ў механіцы, але прынцып аднолькавы. І гэта простая, па сучасных мерках, рэч вельмі добра і надзейна служыць людзям на ўсіх кантынентах.

Яшчэ сто гадоў таму ў нашых мясцінах ровар быў адметнасцю немалой заможнасці. Яго мог дазволіць сабе набыць чыноўнік, настаўнік (у тыя часы настаўнікі атрымлівалі вельмі добрыя грошы, прыкладам, дазвалялі сабе трымаць у сям'і прыслугу). Набывалі ровары і простыя людзі. Але гэта быў яшчэ не столькі сродак перамяшчэння, колькі нейкая забава.

А вось для нашых бацькоў у шасцідзесятых гадах мінулага стагоддзя ровар стаў ужо вельмі неабходнай рэччу. Каштаваў ён па тых часах не вельмі танна, недзе каля пяцідзесяці рублёў, і ўсё-такі з бюджэту сям'і такія грошы выдзялялісь. Таму што бацькам, простым рабочым, трэба было дабірацца на працу. А гэта ў некага тры, у некага пяць, а ў некага і дзесяць кіламетраў. Грамадскага ж транспарту ў маленькіх гарадках тады практычна і не існавала. Бацька, калі пачаў працаваць у Паставах на лесазаводзе, кожны дзень адмерваў з вёскі і назад па дзесяць кіламетраў. Як тут без ровара?

Зразумела, мы, пацаны, у тыя часы не тое што пра нейкія «Арляняты» не ведалі, мы марылі толькі аб адным: каб бацькі, прыехаўшы з працы, дазволілі нам вечарам пару гадзін паездзіць на іхніх роварах. А вось тут пачыналася асалода. Асфальтаваных вуліц у Паставах яшчэ не было. Брук. Па плошчы, дзе быў асфальт, таксама не надта пакружаняеш. Затое нам пашанцавала, што стаялі ў Паставах ракетчыкі. І ад горада да месца размяшчэння ракет праклалі яны дарогу з жалезабетонных пліт, кіламетраў з восем. Вось тут і наладжваліся гонкі. Канешне, гонкі — гэта занадта гучна, але нам падабалася. Гляджу сёння па тэлевізары на міжнародныя гонкі веласіпедыстаў, дзе, дарэчы, ёсць прысутнасць і беларусаў, і ўспамінаю нашы, тагачасныя. Не параўнаць ні роварны, ні ўзровень, пра хуткасць і гаварыць няма чаго. А вось азарт, відаць, аднолькавы. У нашых тагачасных «гонках» самымі непрыемнымі былі аварыі. І справа не ў пабітых каленках, локцях ці лбах. А вось калі ламаўся ровар — тут ужо не жартачкі. Да раніцы трэба аднавіць. Ну, прабітую камеру, мы яе называлі «кіхой», заклейваць умелі добра. А вось калі парваўся ланцуг, альбо паламалася «зорачка» — тут ужо браліся за рамонт усёй грамадой, шукалі патрэбныя дэталі, разам рамантавалі. Я сказаў бы, і гэта не нейкі вобраз, у той час ровар аб'ядноўваў нас, збіваў у гурт, дружны і бескарыслівы. Калі ўжо сталі юнакамі, то ровары адышлі на другі план, з'явіліся іншыя інтарэсы. Але ровар застаўся ў якасці сродку руху. Такім ён быў і пасля прыходу з тэрміновай службы. Такім ён з'яўляецца і цяпер. Напрыклад, мне без ровара, ад таго часу, як вызваляюцца дарогі ад снегу, і да таго часу, як снег зноў ляжа на дарогі, проста не абысціся. На ім хутка дабрацца да свайго поля, на ім хутчэй наведаць могілкі, на ім у рэшце рэшт у краму хутчэй падскочыць. Аўтамабіля няма, ды я яго і баюся, а ровар — лацвей.

Дарэчы, аб аўтамабілях. Разумею, што так шмат ровараў у азіяцкіх краінах. Там узровень жыцця адпавядае такому сродку руху. Але ж Еўропа, асабліва краіны яе паўночнай часткі, тая ж Галандыя, Данія і іншыя — глядзіш па тэлебачанні рэпартажы адтуль — і проста, як мурашы паўсюль — веласіпеды. Магчыма, больш дасканалыя, прыгожыя, але веласіпеды. Старая Еўропа ў цэнтрах сваіх гарадоў адназначна мае вузкія вуліцы, ды і не на вузкіх там шмат «пробак». Але мне здаецца, што тут ёсць і яшчэ адзін фактар прыхільнасці еўрапейца да ровара. Пры іх маларухомым, гарадскім жыцці ровар усё-такі патрабуе фізічных намаганняў. А гэта ж для здароўя карысна. Калі ж чытаю ці гляджу, як на роварны пад'язджае да свайго міністэрства які-небудзь еўрапейскі міністр... Можна ўсміхнуцца — на публіку працуе. А можна і задумацца: ці не адна з прыкмет гэтага самага дэмакратызму? Ды і міністру, як любому чалавеку, патрэбны моцныя мускулы.

Паболела ровараў і ў маім родным гарадку. Быў перыяд — сямідзесятыя—васьмідзесятыя гады, калі іх стала значна менш. Больш было грамадскага транспарту, больш з'явілася ў карыстанні людзей аўтамабіляў, асабліва матацыклаў (а матацыкл жа — ровар у прынцыпе, толькі рухае коламі не чалавек, а матор). А сёння ровараў стала нашмат больш. Прайдзіце па любой вулачцы любога раённага гарадка — абавязкова ці абгоніць вас праз некалькі хвілін, ці паедзе вам насустрач веласіпедыст. Шмат іх і за горадам, на шашы. Гэта, відаць, стварае пэўныя праблемы для бяспекі руху, асабліва, калі на ровар садзіцца дзіця. Выйсце ёсць. Але ў нашым рэгіёне я бачыў толькі адну шашу, дзе побач пракладзена свая, веласіпедная асфальтаваная дарожка. Гэта каля Мядзела. І яшчэ пра праблемы. Яны, са значным павышэннем колькасці роваравў, з'явіліся ў міліцыі. Крадуць. Ад крам, ад іншых грамадскіх месцаў, а то і проста з дварышчаў неабачлівых людзей, якія заганяюць ровар не ў хлеў ці ў нейкую прыбудову, а проста кідаюць яго блізка ад весніц. І выкрыць такі крадзеж, як расказвалі мне супрацоўнікі міліцыі, вельмі цяжка. Таму што злодзей адразу мяняе раму, ставіць новыя, таксама ўкрадзеныя, колы. Гэта найбольш датычыцца старэнькіх, не аднаго дзесяцігоддзя жыцця рэчаў. Новы, зусім іншай аздобы ровар злодзей браць пабаіцца. Цяпер практычна на любой веласіпеднай стаянцы ля крамы — а ёсць у нас і такія — бачыш: прыехаў чалавек на ровары, загнаў яго ў рашотку. І дастае ланцуг, замыкае.

Размаўляю з малазнаёмым аднагодкам. Вучыліся некалі ў паралельных класах.

— Як справы?

— Ды вось ровар учора ўкралі.

— У міліцыю звяртаўся?

— Не буду.

— А чаму?

— Я лепш украду, падбяру такі, які майму адпавядаў.

Нейкая ланцуговая рэакцыя атрымліваецца.

Чытач заўважыў, што, пішучы пра простыя рэчы, я люблю звяртацца да літаратуры, прыводзіць цытаты з прозы, паэзіі. Ну як абысціся без гэтага. Успамінаў, пашукаў. Ёсць. І не веласіпед, а ровар. У Рыгора Барадуліна:

Прывёз хлапец на ровары
Курэй і мёду збан.

Алесь КАСЦЕНЬ.
Віцебская вобласць.

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» ПРОВОДИТ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ АВТОМОБИЛЬНОЙ ТЕХНИКИ

Извещение о проведении торгов на 8-ом открытом аукционе по продаже объектов республиканской собственности 15 августа 2007 г.

ТЗ-22М (без тележки) ш. 705369, дв. 14249, 1991 года выпуска, 48619 км пробега. **Начальная цена продажи — 33 000 000 рублей, сумма задатка — 3 300 000 рублей.**

Место нахождения: в/ч 06752 н.п. Мачулищи, Минский район.

8-ой аукцион состоится в 11.00 15 августа 2007 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 4, ГО «Белресурсы».

Прием документов на участие в аукционе заканчивается в 17.00 13 августа 2007 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, комн. 618, РУП «Белспецконтракт».

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, резиденты Республики Беларусь и нерезиденты, оплатившие задаток. Физические лица обязаны предоставить паспорт и заполнить необходимые документы установленного образца. Юридические лица предоставляют необходимый пакет документов.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи 15 августа 2007 года.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Все денежные расчеты производятся путем перечисления их на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018 в Октябрьском отделении ОАО «БелПСБ» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1 код 357, УНП 101099370. **Без НДС**.

Справки по тел.: (017) тел./факс 224-88-05.

Наш адрес в Интернете:
www.belspeckontrakt.com e-mail: info@belspeckontrakt.com

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПРАДСТАЎНІК ЗША АПРАЎДВАЕ АТАМНЫЯ БАМБАРДЗІРОЎКІ ЯПОНІІ

Спецыяльны прадстаўнік ЗША па нераспаўсюджанню ядзернай зброі Роберт Джозэф выступіў у апраўданне амерыканскіх атамных бамбардзіровак Хірасімы і Нагасакі. Дыпламат сказаў, што яны «паклалі канец вайне, якая каштавала б яшчэ мільёны жыццяў — не толькі сотні тысяч жыццяў у краінах-саюзніках, але і літаральна мільёнаў жыццяў японцаў».

Гэту заяву дыпламат зрабіў у Вашынгтоне на прэс-канферэнцыі па пытаннях ядзернага разбраення, якая праходзіла сумесна з намеснікам міністра замежных спраў Расіі Сяргеем Кісляком. Пры гэтым Джозэф дадаў, што яго пункт погляду падзяляецца «большасцю гісторыкаў». Прадстаўнік Расіі выказаў нязгоду з меркаваннем Джозэфа і нагадаў, што існуе, «безумоўна, больш чым адзін погляд» на тое, наколькі мудрым было рашэнне аб «выкарыстанні ядзернай зброі напрыканцы Другой сусветнай вайны». Прыведзеную Джозэфам ацэнку Расія не падзяляе, удакладніў Кісляк.

ЛІТОЎСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ ЗАСТАНЕЦЦА БЕЗ РУСКАМОЎНЫХ НАВІНАЎ

На Літоўскім нацыянальным ТБ закрываюць апошнюю інфармацыйную праграму на рускай мове — дзесяціхвілінны выпуск навінаў. Кіраўніцтва кампаніі патлумачыла гэта нізкім рэйтынгам праграмы.

Адпаведную прапанову прыняў Савет тэлекампаніі, у склад якога ўваходзяць прадстаўнікі прэзідэнта, урада і парламента рэспублікі, а таксама грамадскіх арганізацый. Змяненні ў сетцы вяшчання ўступяць у сілу з пачаткам новага сезона — восенню 2007 года.

У КРЫМЕ НА АДНЫМ З АТРАКЦЫЁНАЎ ПАМЁР БЕЛАРУС

Адпачываючы з Беларусі памёр падчас катання на водным атракцыёне на пляжы ММЦ «Гурзуф», паведамляе Інтэрнэт-рэсурс ALLCrimea.NET.

26-гадовы курортнік быў знойдзены мёртвым пасля катання на надуўным крузе. Абставіны смерці расследуюцца. Па адной з версій, памерлы напярэдадні шмат выпіў і, магчыма, у яго не вытрымала сэрца.

ВУЧОНЫЯ ДАКАЗАЛІ: АДАСПАЦЦА НА ВЫХАДНЫХ НЕМАГЧЫМА

Вучоныя сцвярджаюць, што людзі, якія пастаянна недасыпаюць, не могуць «наверстаць» упушчаныя гадзіны сну, адсыпаючыся на выхадных.

У хранічна недасыпаючага чалавека перастае працаваць сам механізм аднаўлення нервовай сістэмы падчас сну і прападае ахвота спаць. Наступствы недасыпання — раздражняльнасць, празмерная вага, хваробы сэрца.

СЛАВЯНСКІ ПАРЛАМЕНЦКІ САЮЗ ЗВЯРНУЎСЯ ДА КІРАЎНІКА ЛІВІІ

з просьбай памілаваць балгарскіх медыкаў

1—3 ліпеня ў Мінску праходзіла першая пасля афіцыйнай рэгістрацыі сесія Міжнароднай грамадскай арганізацыі «Славянскі парламенцкі саюз». Удзельнікі сесіі прынялі зварот да кіраўніка Лівіі палкоўніка Кадафі з просьбай памілаваць пяцярых балгарскіх медсясцёр і аднаго палесцінскага ўрача, якіх улады Лівіі прызналі вінаватымі ў наўмысным заражэнні дзяцей вірусам СНІДу.

Паводле слоў кіраўніка Славянскага парламенцкага саюза, дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі і аднаго з лідараў КПБ Сяргея Касцяна, з ініцыятывай звярнуцца да палкоўніка Кадафі выступіла дэлегацыя балгарскіх парламентарыяў і пасольства Балгарыі ў Мінску.

Таксама падчас пасяджэння сесіі Саюза быў разгледжаны праект мадэльнага закона аб развіцці турызму паміж славянскімі дзяржавамі. У сесіі прынялі ўдзел парламентарыі Беларусі, Расіі, Украіны, Сербіі, Босніі, Малдовы, Балгарыі, Чэхіі і Славакіі.

Выступаючы на адкрыцці сесіі, Сяргей Касцян заявіў, што рэгістрацыя сёлета Саюза была негатыўна ўспрынята ў свеце «славянскімі непрыхільнікамі». «У свеце створаны і працуюць больш за 10 міжнародных і рэгіянальных парламенцкіх саюзаў і аб'яднанняў. І нікога гэта не турбуе. Ніхто не гаворыць, што гэта перашкаджае будаўніцтву агульнага дома. А вось створаны славянамі міжнародны парламенцкі орган сустрэты са злосцю, абурэннем. Нам сталі навешваць усялякія ярлыкі», — адзначыў Сяргей Касцян.

«Чаму ж так баяцца нашага яднання, братэрства і супрацоўніцтва? Відаць, таму, што нашымі славянскімі каштоўнасцямі з'яўляюцца прынцыпы міру і супрацоўніцтва паміж народамі і кантынентамі. Мы, славяне, не проста жадаем міру і супрацоўніцтва, мы настойваем на супрацоўніцтве роўных сярод роўных. Мы адстойваем прынцыпы абароны і падтрымкі слабых. Мы выступаем за самастойнасць і цэласнасць славянскіх і іншых дзяржаў. Мы супраць умяшання ва ўнутраныя справы адзін аднаго», — дадаў ён.

Пры гэтым старшыня Саюза дадаў, што негатыўнае стаўленне «не павінна палохаць» парламентарыяў і «калі славянам спатрэбіцца і 300 гадоў, мы з пакалення ў пакаленне... будзем ісці крок за крокам да славянскай еднасці».

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

ДЗЯЖУРСТВЫ НА «ГАРАЧАЙ» ЛІНІІ ЎПРАЎЛЕННЯ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ МІНАБЛВЫКАНКАМА (017) 220-20-25

10 ліпеня: ***9.00—12.00*** — намеснік галоўнага ўрача абласнога радзільнага дома Тамара Канстанцінаўна АЛЯКСАНДРАВА.

14.00—17.00 — галоўны спецыяліст упраўлення аховы здароўя па анкалогіі Святлана Мікалаеўна СІРЭНКА.

17 ліпеня: ***9.00—12.00*** — галоўны ўрач Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Дзмітрый Уладзіміравіч ЗАЙЦАЎ.

Беларусь — тэрыторыя якасці

Адпраўленне лістоў, бандэроляў альбо пасылак у краіны блізкага ці далёкага замежжа для многіх жыхароў Беларусі справа звыклая. Прычым настолькі, што ўжо і ў думках няма, а чаму менавіта так яны павінны быць запакаваны, менавіта так — адрасаваны... Нават пытанне, ці дойдзе, хвалюе чыста сімвалічна, бо пераконваліся ж (і не раз!), што дойдзе.

Вось ужо 60 гадоў (з 5 чэрвеня 1947 года) паштовая адміністрацыя краіны з'яўляецца членам Сусветнага паштовага саюза — старэйшай у свеце міжнароднай арганізацыі, якая амаль паўтара стагоддзя таму распрацавала адзіныя правілы прыёму, афармлення, перавозкі і транзіту міжнароднай пісьмовай карэспандэнцыі.

— Для ўсіх дзяржаў—членаў Саюза (а іх сёння без малога 200) агульныя абавязкі, агульная адказнасць, якую нясуць краіна-адпраўшчык, краіна-атрымальнік. Агавораны тэрміны... Іншымі словамі, з мэтай шырокага ўзаемнага абмену карэспандэнцыяй, забеспячэння свабоды перасылкі ўтворана адзіная паштовая тэрыторыя, — гаворыць начальнік аддзела міжнароднай пошты РУП «Белпошта» Алена Аляксееўна Васюціна...

Аб парадку, які забяспечаны на нашым, беларускім участку тэрыторыі, гаворыць той факт, што сёлета прадпрыемству быў уручаны залаты сертыфікат Сусветнага паштовага саюза ў галіне кіравання якасцю.

Валянціна ДОЎНАР.

Згарэлі аўто па дарозе

У Талачынскім раёне згарэлі 6 з 8-і новых легкавых аўтамабіляў, якія вадзіцель адной казахстанскай фірмы перавозіў на аўто «Сканія».

Як паведамілі ў прэс-службе УУС Віцебскага аблвыканкама, калі вадзіцель спыніўся на адпачынак па дарозе Брэст—Мінск —мяжа Расійскай Федэрацыі, машыны пачалі гарэць. Нават суправаджальныя дакументы згарэлі. Як лічыць міліцыя, узгаранне адбылося па прычыне замыкання электраправодкі «Сканіі». Кіроўца атрымаў ад агню апёкі 1-й і 2-й ступеняў і быў дастаўлены ў бальніцу.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Нямецкі дэпутат упадабаў «Дарыду»

Днямі прыватны самалёт даставіў у Беларусь нямецкую дэлегацыю. У рамках візіту прадстаўнікі Германіі пабывалі на заводзе «Дарыда», дзе карэспандэнту «Звязды» ўдалося атрымаць эксклюзіўнае інтэрв'ю **дэпутата Бундэстага Роберта ХОХБАУМА**, адказнага за супрацоўніцтва з нашай краінай. У няспешнай размове за кубкам гарбаты ўзялі ўдзел **заснавальнік завода «Дарыда», дэпутат Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Дзялендзік і дырэктар «Завода фруктовых напояў ВДХ» Алена Барычэўская.** Усё ж такі нашы дырэктары ўсім кіраўнікам кіраўнікі: Алена Мікалаеўна выдатна валодае нямецкай мовай і на сустрэчы прысутнічала ў якасці... перакладчыка.

Спадар Хохбаум на нашай радзіме ўпершыню, таму шмат дзе варта пабываць і шмат з кім пазнаёміцца. У трохдзённы графік паездкі ўвайшло наведванне Брэста, дзе палітык азнаёміўся з дзейнасцю прадпрыемства «Санта-Брэмар» і наогул «законамі жыцця» прадпрыемстваў у складзе свабоднай эканамічнай зоны «Брэст», з кіраўнікамі якой ён сустрэўся, перамовы прайшлі і з прадстаўнікамі абласнога выканаўчага камітэта.

— Дагэтуль маё знаёмства з Беларуссю было выключна завочным — па аповедах і паведамленнях у мас-медыя, — прызнаецца дэпутат нямецкага парламента. — Апынуўшыся тут, я вельмі ўважліва прыглядаюся да вашай краіны, цікаўлюся літаральна ўсім. І ведаеце, у мяне цудоўнае ўражанне ад Беларусі: радуюць вока чысціня і парадак, якія пануюць тут, кранае адкрытасць і добразычлівасць людзей. Упэўнены, гэта не апошні мой прыезд у Беларусь.

Акрамя непасрэднага знаёмства з краінай, у палітыка былі і чыста эканамічныя мэты: даведацца пра дзейнасць мясцовых прадпрыемстваў, наладзіць двухбаковыя сувязі беларускіх і нямецкіх кампаній.

— Я бачу перспектывы паспяховага эканамічнага развіцця Беларусі, улічваючы яе спрыяльнае геапалітычнае становішча, — даводзіць спадар Хохбаум, — краіна знаходзіцца літаральна на мяжы з Еўрасаюзам і пры гэтым адкрывае велізарны ўсходні рынак. Ацаніўшы працу прадпрыемстваў, магу сказаць, што ў Беларусі ёсць умовы для паспяховага развіцця кампаній. Усе гэтыя фактары дазваляюць прагназаваць добрую будучыню для краіны ў плане супрацоўніцтва з замежнымі фірмамі. Мы ведаем, што беларускі бок станоўча ставіцца да паступлення замежных інвестыцый, у прыватнасці з Германіі, а ў нас, у сваю чаргу, ёсць мноства прадпрыемстваў, якія зацікаўлены ў падобным супрацоўніцтве. Ды і я пасля свайго вяртання буду пераконваць фірмы ў магчымасці рэалізацыі такога супрацоўніцтва. Зразумела, існуе пэўная бюракратычная цяганіна, на жаль, яе не пазбегнуць. Пакуль цяжка сказаць, прадпрыемствы якога профілю цікавяць нямецкі бок у плане інвеставання, мяркую, што з улікам аграрнага багацця краіны і ў плане прадпрыемстваў, і ў плане ўгоддзяў, гэта будзе менавіта сельскагаспадарчы накірунак. Інвестараў заўжды хвалюе гарантаванасць інвестыцый, вось і падчас гэтага візіту мы надаём увагу пытанням крэдытавання. Абсалютная большасць нямецкіх прадпрыемстваў вядзе бізнэс з прыцягненнем крэдытаў. Калі крэдытныя ўмовы будуць прымальныя для рынку, калі ёсць гарантыі, калі ў банкаўскай сферы будзе большая яснасць, тады і нямецкія прадпрыемствы больш ахвотна будуць удзельнічаць. Пакуль гэта пытанні для высвятлення.

Спадзяёмся, сустрэчы ў Міністэрстве эканомікі і ААБ «Беларусбанк», якія запланаваны для нямецкай дэлегацыі, будуць плённымі. З усіх беларускіх прадпрыемстваў дэпутата Бундэстага найбольш цікавіў менавіта завод «Дарыда»:

— Справа ў тым, што ў маёй выбарчай акрузе функцыянуе аналагічнае прадпрыемства, так жа паспяхова, як і «Дарыда», пра дзейнасць якой мяне падрабязна інфармавалі.

Высветлілася, што кола інтарэсаў нямецкага госця канцэнтравалася, у прыватнасці, на маркетынгавым боку: як завод працуе на рынку, як адсочвае сваю прадукцыю і імкнецца выйсці з новай — надзвычай шырокі асартымент дэлегат адзначыў асабліва, маўляў, любы, нават самы пераборлівы, гурман знойдзе сярод прадукцыі «Дарыды» ваду сабе па густу. Знайшоў і нямецкі дэпутат, які аддае перавагу напоям з большым узроўнем утрымання мінеральных рэчываў, яго выбар — мінеральная вада «Дарыда». Гэта і нядзіўна, ваду атрымліваюць са свідравіны глыбінёй 410 метраў, захоўваючы яе натуральнасць і ўсе лекавыя ўласцівасці, нездарма ёй прысуджаны сертыфікат адпаведнасці еўрапейскім стандартам якасці.

— Разліваць ваду можа любы вытворца, — кажа Роберт Хохбаум, — аднак знайсці добры смак, адчуць тыя тонкасці, якіх патрабуе рынак — гэта вельмі складана.

З лёгкай рукі Уладзіміра Дзялендзіка размова перацякла ў палітычнае русла.

— На дадзеным этапе ў адносінах Беларусі і Германіі ёсць некаторыя складанасці, — адзначае спадар Хохбаум. — Аднак маюцца перадумовы для іх паляпшэння ў самай блізкай будучыні. Галоўнае, каб над гэтым працавалі абодва бакі, ішлі адзін аднаму насустрач, толькі тады будзе збліжэнне.

Са свайго боку адказны за супрацоўніцтва з Беларуссю абяцаў зрабіць усё магчымае для наладжвання двухбаковых сувязяў. Паводле слоў Роберта Хохбаума, у заходніх краінах склалася меркаванне аб некаторай ізаляцыі Беларусі, выправіць яго могуць толькі кантакты, сустрэчы, перамовы. Крокам у гэты бок нямецкі дэпутат назваў сустрэчу Прэзідэнта Беларусі з журналістамі заходніх СМІ, на якой закраналіся пытанні міжнароднага супрацоўніцтва. Спадар Хохбаум адзначыў, што не апошнюю ролю адыграла тут і абвастрэнне адносінаў з Расіяй з-за нафтагазавых супярэчнасцяў, маўляў, гэта звярнула Беларусь да Еўрасаюза, — як кажуць, не было б шчасця, ды няшчасце дапамагло.

Абгрунтавалі і яшчэ адну цікавую тэму — прадстаўніцтва прадпрымальнікаў у парламенце. Высветлілася, што ў Германіі гэта пытанне таксама ўзнікла, вядуцца спрэчкі і некаторыя аналітыкі прагназуюць, што калі справы пойдуць так і далей, то дарога ў нямецкі парламент для прадпрымальнікаў можа быць закрыта. Прадстаўнік кансерватыўнай партыі, спадар Хохбаум у бізнэсе не заняты, аднак не бачыць падстаў для выкрэслівання бізнэсменаў з парламенцкага жыцця, бо без іх прадстаўніцтва не будзе поўным.

— Важны толькі механізм, паводле якога прадпрымальнікі трапляюць у парламент, — падкрэслівае сваю думку нямецкі дэпутат, — трэба, каб для выбаршчыкаў гэта інфармацыя была адкрытай.

Не маглі мы не пацікавіцца і тым, які вобраз Беларусі фарміруюць нямецкія СМІ.

— На жаль, як правіла, негатыўны, — паведаміў нам спадар Хохбаум. — Галоўная прычына ў тым, што беларускую рэчаіснасць асвятляюць аднабакова. Пішуць часцей за ўсё пра палітыку. Абмяркоўваючы Беларусь, звычайна закранаюць усяго толькі дзве тэмы — апазіцыю і прафсаюзы. Аднак я перакананы, што ў працэсе сустрэч, перамоў усё зменіцца да станоўчага. Вось і я ў сваім дакладзе раскажу пра тое, што ўбачыў на свае вочы. Дарэчы, у мяне ёсць перавага, бо мае калегі звычайна паведамляюць выключна пра Мінск, а я змагу прадаставіць інфармацыю аб тым, што адбываецца па-за межамі сталіцы. Краіна і людзі аказалі на мяне толькі станоўчае ўражанне. Узаемаадносіны паміж нашымі краінамі павінны істотна змяніцца, і гэта ўжо не за гарамі.

Хочацца верыць.

Ала МАЧАЛАВА.

Прамая лінія

АБ ІЛЬГОТАХ. І НЕ ТОЛЬКІ

На пытанні чытачоў «Звязды» адказваюць намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валяр'ян Васільевіч КАРОЛЬ, начальнік галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Валянціна Вікенцьеўна КАРАЛЁВА, начальнік аддзела па справах ветэранаў і пажылых людзей Іван Пятровіч НАГІБІН, а таксама кансультант упраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Яніна Станіславаўна ЛАДЫШАВА.

Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 27, 30 чэрвеня.)

☎ — Я з'яўляюся непаўналетнім вязнем нацызму, у 5-гадовым узросце прайшоў праз турму нямецкіх спецслужбаў у Глыбокім, дзе нас трымалі як заложнікаў. А пытанняў некалькі. Чаму статус удзельніка вайны маюць толькі асобы, якія нарадзіліся ў 1933 годзе і раней? Далей. Чаму для дзяцей—блакаднікаў Ленінграда льготы ёсць, а для дзяцей, што прайшлі праз месцы зняволення падчас вайны — не? І нарэшце. Якой будзе падтрымка малалетніх вязняў нацызму, на што мы можам разлічваць і ці будзе гэта катэгорыя нейкім чынам адлюстравана ў будучым указе па адраснай сацыяльнай дапамозе?

Уладзімір Іванавіч МАІСЕЕНКА, *г. Мінск*

— Законам «Аб ветэранах» вызначаны катэгорыі ветэранаў і асобаў, што пацярпелі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Так, згодна з законам, да катэгорыі ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай адносяцца грамадзяне, якія прымалі ўдзел у баявых дзеяннях па абароне Айчыны ці ў забеспячэнні вайсковых часцей арміі ў раёнах баявых дзеянняў, а таксама партызаны і падпольшчыкі. Адначасова былыя вязні нацызму аднесены да катэгорыі асобаў, якія пацярпелі ў гады Вялікай Айчыннай. Прычым узроставы цэнз для ўстанаўлення статуса вязня не вызначаны.

Сапраўды, з уступленнем у сілу новага закона пералік ільгот і гарантый асобам, што пацярпелі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, зменшыцца. Разам з тым нельга не заўважыць, што ў сувязі з гэтым, а таксама з мэтай узмацнення адраснай сацыяльнай падтрымкі зараз ідзе распрацоўка ўказа «Аб адраснай сацыяльнай падтрымцы насельніцтва». І ў праекце гэтага ўказа ў тым ліку прадугледжваюцца былыя вязні фашызму.

☎ — На нашым прадпрыемстве працуе шмат інвалідаў III групы, адзінай значнай льготай якіх зараз з'яўляецца 50-працэнтная скідка на лекі. Яна застанецца?

Рыгор Аляксандравіч ІЛЫНЕЦ, *г. Мінск*

☎ — У маёй 31-гадовай дачкі III група інваліднасці. Працаваць яна не можа, тады як пенсія складае ўсяго крыху больш за 130 тыс. рублёў. Ці ёсць у дачкі якія-небудзь ільготы па набыццю лекаў?

Зінаіда Іванаўна, *г. Мінск*

З уступленнем у сілу новага закона льгот па леках у інвалідаў III групы не будзе. У той жа час варта паўтарыцца: чакаецца, што інваліды III групы стануць адной з катэгорый, на якую будзе скіраваны ўказ «Аб адраснай сацыяльнай падтрымцы насельніцтва».

☎ — Якімі льготамі будуць карыстацца пенсіянеры, якія маюць пасведчанне і медаль «Ветэран працы»?

Валянціна Сцяпанаўна ЯРУК, *г. Маладзечна*

☎ — Адкажыце, калі ласка, якія льготы маюць дзяржаўныя служачыя? І чаму наконт іх няма ніводнага слова ў новым законе? І яшчэ. Патлумачце, якімі льготамі будуць рэальна карыстацца ветэраны працы ў сельскай мясцовасці, якія не маюць дач і не знаходзяцца ў гаражных кааператывах?

Іван Андрэевіч АКУЛІЧ, *Іўеўскі раён*

— За ветэранамі працы будуць захаваны не толькі «дачныя» і «гаражныя» льготы, але таксама гарантыі па забеспячэнню санаторна-курортнымі пуцёўкамі на ўмовах частковай аплаты і забеспячэнню тэхнічнымі сродкамі рэабілітацыі. Пры гэтым сама медаль «Ветэран працы» — гэта найперш маральная ўзнагарода. І з 1992 года ўзнагароджанне такім медалём ужо не робіцца.

Што ж да дзяржслужачых, то асаблівых сацыяльных ільгот у іх няма. І менавіта таму гэта катэгорыя не ўзгадваецца ў новым законе.

☎ — Чаму ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны дагэтуль не распрацавалі палажэння аб спецыяльнай установе для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якая знаходзіцца ў Мінску па адрасу вул. Лынькова, 39? І які лёс чакае гэту ўстанову?

Марына Мікалаеўна, *г. Мінск*

— Згодна з палажэннем аб Міністэрстве працы і сацыяльнай абароне, спецыяльная ўстанова для дзяцей-інвалідаў у сістэму ўстаноў міністэрства не ўваходзіць. Спецыяльная ўстанова па Лынькова,39 знаходзіцца ў кампетэнцыі Мінскага гарвыканкама, дзе зараз і вырашаецца пытанне аб яе рэарганізацыі.

— Калі ў Мінску нарэшце будзе створана паўнавартасная служба сядзелак?

Таіса Фёдараўна, *г. Мінск*

— Цяперашняя нарматыўна-прававая база дазваляе тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва аказваць паслугі пагадзіннага дзённага догляду грамадзян, якія страцілі магчымасці да самаабслугоўвання, інакш кажучы, — паслугі сядзелкі. Пры гэтым поўны кошт такіх паслуг у Мінску складае 1069 рублёў за 1 гадзіну дзяжурства. Аднак недахоп фінансавых сродкаў становіцца перашкодай для ўкамплектавання цэнтраў неабходнай колькасцю работнікаў. Так, у Савецкім раёне, дзе вы пражываеце, з дзвюх пасад сацыяльных работнікаў, якія аказваюць паслугі сядзелкі, адна пасада застаецца вакантнай. Дарэчы, нялішне заўважыць, што ў абавязкі сядзелкі не ўваходзіць купля і дастаўка на дом прадуктаў і прадметаў першай неабходнасці, а таксама ўборка кватэры, выкананне ін'екцый і масажу.

Сяргей ГРЫБ.

ЧАРНІЦЫ Ў ЛЕСЕ І НА РЫНКУ

За клубніцамі прыйшла чарга чарніц, і каб на свае вочы ўбачыць, як яны сёлета ўрадзілі паехаў у лес за вёску Лесіна, а гэта за 20 км ад Баранавіч. Там вялікія абсягі чарнічніку і думалася, што набраць ягады праблемы не будзе.

На нейкім кіламетры лясной дарогі ўжо стаяла чатыры аўтамашыны, але ягады ўсім хапіла б, каб яе не збіралі скрабкамі, якія маюць падабенства з відэльцамі. Месцамі чарнічнік моцна пашкоджаны — з галінак садрана лісце. Такі збор забаронены, але ў лесе на законы асабліва ўвагу не звяртаюць. Збіраць чарніцы цяжкавата, бо яны яшчэ не выспелі і не вельмі адрываюцца ад галінак. За пару гадзін назбіраў з кілаграм і падаўся дамоў — пачала моцна балець спіна. Пашкадаваў, што не прыхапіў з сабой табурэтку — сядзеў бы і наўкол сябе збіраў тыя ягады.

А на рынку чарніцы ў цане. І не дзіўна, што людзі кінуліся ў лес. 8-літровае вядро ягады каштуе 25 тысяч рублёў. Летась жа чарніцы былі не такія дарагія. І цана трымаецца. А ўсё гэта ад таго, што ягады скупляюць прадпрымальнікі. На ўваходзе на кірмаш «Палескі», што ў Баранавічах, стаяў мужчына і ссыпаў чарніцы ў поліэтыленавыя мяхі, а некалькі жанчын стаялі ў чарзе, каб прадаць яму ягады.

А што датычыцца другіх ягад, то за трохлітровае вядзерца маліны прасілі 8 тысяч, вядро (10 літраў) вішні — 18 тысяч, парэчкі (10 літраў) — 7 тысяч рублёў. Выходзіць, што чарніцы — адна з самых дарагіх ягад.

Сымон СВІСТУНОВІЧ. Фота аўтара.

36,6°

ПРА СЯРЭБРАНЫЯ ЛЫЖКІ І ГЕННУЮ ІНЖЫНЕРЫЮ

Сёння ў Інтэрнэце і «жоўтай» прэсе можна сустрэць шмат «страшылак», прысвечаных генна-мадыфікаваным арганізмам (ГМА). У якой ступені ім можна давяраць? Дзе праўда, а дзе — фантазія прагных да сенсацыі журналістаў? Паспрабуем разабрацца.

Заплямленая рэпутацыя

Восенню 1989 года ў ЗША адбыўся так званы «трыптафанавы» інцыдэнт, які значна скараціў колькасць прыхільнікаў геннай інжынерыі (ГІ). Мадыфікаваная «версія» L-трыптафана (харчовай дабаўкі) выклікала смерць 38 чалавек, больш за тысячу амерыканцаў атрымалі сур'ёзныя праблемы са здароўем.

У пачатку 80-х гадоў мінулага стагоддзя L-трыптафан быў вельмі папулярным у жыхароў ЗША прэпаратам. Яго прымалі пры бяссонніцы, перадменструальным сіндроме, дэпрэсіі як «натуральны» індуктар сератаніна. Набыць яго можна было без рэцэпта ў любым магазіне здаровага харчавання. Калі здарыўся скандал, грамадская думка вуснамі сродкаў масавай інфармацыі абвясціла анафему генай інжынерыі і ўсім генна-мадыфікаваным прадуктам. А вось што паказала афіцыйнае даследаванне. Прычынай сумнага інцыдэнту стаў не сам прэпарат, а спрашчэнне працэдуры яго ачысткі. Колькасць актываванага вугля ў фільтрах была ўдвая зменшана, акрамя таго падчас ачысткі была выключана працэдура фільтрацыі. Атрыманы прэпарат меў таксічныя пабочныя прымесі, якія і прывялі да трагедыі.

— Вынікі даследавання «трыптафанавага» інцыдэнту паказалі, што яго прычыны звязаны з тэхналогіямі вытворчасці прэпарата, а не з выкарыстаннем генна-мадыфікаваных арганізмаў, — адзначае **кіраўнік Нацыянальнага каардынацыйнага цэнтра біябяспекі пры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандр ЯРМІШЫН.** — Аналагічная гісторыя магла здарыцца і з прамысловымі мікраарганізмамі, створанымі з дапамогай традыцыйных метадаў селекцыі. Калі кіравацца логікай праціўнікаў ГМА, трэба забараніць, напрыклад, касторавае масла, бо насенне клешчавіны, з якога атрымліваюць тое масла, мае ў сваім складзе адзін з самых моцных ядаў — рыцын. Парушэнне тэхналогіі вытворчасці і траплянне ў масла рыцыну таксама можа прывесці да трагічных наступстваў.

У выпадку з L-трыптафанам атрымалася як у анекдоце пра сярэбраныя лыжкі: лыжкі знайшліся, а непрыемны асадак застаўся. Давер да геннай інжынерыі і яе прадуктаў быў падарваны.

Часта асновай «страшылак» пра ГМА з'яўляецца дакладны факт, які выварочваецца навыварат ці суправоджаецца недакладным з навуковага пункту гледжання каментарыем. Так атрымалася і з сумна вядомай гісторыяй пераносу гена бразільскага арэха ў сою. У «жоўтай» прэсе вынікі паспяховага насамрэч эксперымента падаваліся наступным чынам: маўляў, вучоныя хацелі атрымаць супер-карысны прадукт, а атрымалі супер-алерген. Сцвярджалася нават, што «многія пацярпелыя ведалі пра сваю алергію на бразільскі арэх і ніколі яго не набывалі, але ім і ў галаву не магло прыйсці, што бразільскі арэх можа аказацца ў соі. Этыкетка тавару на гэты конт саромліва маўчала».

— Такая соя сапраўды атрымана, — пацвярджае Аляксандр Ярмішын, — і гэта сапраўды вельмі карысны кармавы гатунак. Аднак, нягледзячы на тое, што азначаную трансгенную сою меркавалася выкарыстоўваць выключна для вытворчасці кармоў, кампаніяй-распрацоўшчыкам (Pioneer Hi-bred Int.) было прынята рашэнне спыніць выпрабаванні. За межы лабараторыі гэты гатунак ніколі не выходзіў.

Крызіс даверу да сучасных біятэхналогій у Заходняй Еўропе прывёў да адтоку інвестыцый у гэтую галіну навукі, у асобных краінах даследаванні генна-інжынернай накіраванасці ўвогуле былі забаронены. Людзі заўсёды з насцярожанасцю ставіліся да ўсяго новага, невядомага. Гэта інстынкт самазахавання. Аднак без развіцця, без рыняцця перадавых дасягненняў у навуцы і тэхніцы не было б і прагрэсу.

Паводле слоў Аляксандра Ярмішына, наша дзяржава ўваходзіць у пералік краін, якія далучыліся да Картахенскага пратакола (2002 год, рэгулюе парадак увозу-вывазу генна-інжынерных арганізмаў) і да Орхускай канвенцыі (1999 год, датычыцца пытанняў інфармавання грамадскасці і яе ўдзелу ў прыняцці рашэнняў у галіне экалогіі). У Беларусі ў 2006 годзе было прынята новае заканадаўства аб бяспецы генна-інжынернай дзейнасці, створана сістэма маркіроўкі ГМ-прадуктаў і спецыялізаваныя лабараторыі, якія правяраюць харчовыя прадукты на наяўнасць ГМА-кампанентаў.

Змены ў свядомасці

Увогуле, навошта нам ГМА, калі вакол іх разгараецца столькі спрэчак і ламаецца столькі коп'яў? Паводле слоў **дырэктара Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі, члена-карэспандэнта НАН Беларусі Аляксандра КІЛЬЧЭЎСКАГА**, генная інжынерыя адкрывае вялікія магчымасці практычна перад усімі галінамі народнай гаспадаркі: медыцынай, прамысловасцю, сельскай гаспадаркай, экалогіяй і г.д.

Найбольш «прасунутыя» ў плане геннай інжынерыі аб'екты — расліны, менавіта з імі звязаны амаль усе асноўныя дасягненні П. У свеце ўжо створаны трансгенныя гатункі кукурузы з павышаным сінтэзам лізіну; соі, устойлівай да гербіцыдаў; бульбы, устойлівай да каларадскага жука; люцэрны з павышанай зімастойкасцю. Ёсць гатункі рапсу, соі, кукурузы, здольныя сінтэзаваць бялкі крыві чалавека, жаночага малака, антыцелы і г.д. (так званае «малекулярнае фермерства»).

Шырокае распаўсюджванне сельскагаспадарчыя ГМ-расліны атрымалі ў ЗША. Там толькі зніжэнне выкарыстання гербіцыдаў і ўгнаенняў, якое забяспечваюць генна-інжынерныя гатункі, дазваляе мясцовым фермерам атрымліваць даход 4—5 млрд доларaў у год. Аргенціна, дзякуючы соі, устойлівай да гербіцыдаў, атрымлівае 2 млрд доларaў у год.

Выкарыстанне ГМА ў раслінаводстве, паводле слоў Аляксандра Уладзіміравіча, дазваляе захаваць карысных з пункту гледжання эканалагічнай раўнавагі насякомых (з-за памяншэння доз пестыцыдаў), знізіць забруджванне глебы і вадаёмаў, палепшыць якасць сельгаспрадуктаў. Акрамя таго, пэўныя гатункі мадыфікаваных раслін можна выкарыстоўваць для ачысткі забруджаных цяжкімі металамі і нафтапрадуктамі тэрыторый.

Сёння ў свеце кожны дваццаты гектар, адведзены пад сельскагаспадарчыя культуры, засеяны ГМ-раслінамі. І штогод займаемая імі плошча павялічваецца на 10 млн га. Самыя буйныя пасадкі генна-мадыфікаваных раслін знаходзяцца ў ЗША (каля 50 млн га). Вырошчваюць сельскагаспадарчыя ГМ-расліны Аргенціна, Бразілія, Канада, Кітай. Апошнім часам такія пасадкі з'явіліся і ў кансерватыўнай Еўропе (Іспаніі, Францыі, Чэхіі, Румыніі). Паступова свядомасць еўрапейцаў змяняецца ў бок прыняцця прадуктаў геннай інжынерыі.

Калі гаварыць пра трансгенныя расліны, поспехі ГІ ў гэтым накірунку відавочныя і бясспрэчныя. У выпадку з трансгеннымі жывёламі дасягненні пакуль што значна больш сціплыя. Тым не менш, ужо створаны каля 20 тыпаў трансгенных кароў, коз, свіней, авечак, трусоў, якія прадуцыруюць каштоўныя фармацэўтычныя рэчывы (зноў «малекулярнае фермерства»). Такі спосаб у разы таннейшы за класічны біятэхналагічны.

Рэальныя перспектывы

Летась у Беларусі завяршылася дзяржаўная праграма «Генная інжынерыя», першая ластаўка, якая ініцыявала актыўныя даследаванні ў гэтай галіне. У выніку работы 12 навуковых устаноў беларускімі вучонымі былі атрыманы першыя трансгенныя расліны: бульба, устойлівая да віруса Y, і бульба, устойлівая да некаторых грыбных хвароб; ячмень, устойлівы да гербіцыдаў; журавіны буйнаплодныя з палепшанымі смакавымі якасцямі. Актыўна выкарыстоўваліся класічныя мадэльныя аб'екты — тытунь і арабідопсіс (расліна сямейства капусных). У прыватнасці быў атрыманы мадыфікаваны арабідопсіс, устойлівы да нафтапрадуктаў, трансгенны тытуль з павышанай біямасай. Калі аналагічны перанос пэўных генаў правесці ў дачыненні да значных гаспадарчых культур, гэта дапамагло б вырашыць шэраг праблем сельскай гаспадаркі, адзначыў Аляксандр Уладзіміравіч.

Што датычыцца трансгенных жывёл, спецыялісты Інстытута жывёлаводства НАН Беларусі сумесна з расійскімі калегамі працуюць над праектам стварэння трансгенных коз. Пэўныя зрухі ўжо ёсць. Асноўная задача праекта — атрыманне бялка жаночага малака — лактаферыну.

Сёлета зацверджана новая дзяржаўная праграма «Біятэхналогія», якая стане лагічным працягам папярэдняй. «Наш інстытут ініцыяваў раздзел гэтай праграмы «ДНК-тэхналогіі для сельскай гаспадаркі і аховы здароўя», — патлумачыў Аляксандр Кільчэўскі. — У раслінаводстве будуць створаны маркер-спадарожныя селекцыі шэрагу культур (жыта, пшаніцы,

ДНІ БУДСЛАЎСКАЙ СВЯТЫНІ

1—2 ліпеня прайшлі ўрачыстасці ў Санктуарыі Маці Божай Будслаўскай, удзел у якіх узялі каля 30 тысяч вернікаў з усёй Беларусі.

Спачатку кароль Аляксандр Ягелончык падарыў будслаўскі лес айцам бернардзінам для пабудовы манастыра ў Вільні. Гэта было пяцьсот гадоў таму. Потым манахі пабудавалі на беразе рэчкі Сэрвач каплічку. Пазней там быў асвечаны касцёл. У 1588 годзе на гэтым месцы з'явілася Маці Божая. А ў 1613 годзе з Рыма сюды быў прывезены абраз. Магчыма з таго часу і распачаліся пілігрымкі ў Будслаў. Штогод 2 ліпеня католікі з усёй

Беларусі ідуць да Маці Божай Будслаўскай, якую лічаць нябеснай апякункай Беларускай зямлі. Абраз з'яўляецца цудатворным, у 1996 годзе ён быў каранаваны Папскімі каронамі.

Сёлета ўрачыстасці асаблівыя — у Будслаў не толькі ішлі пешшу, але і... плылі. За тыдзень з Вільні са старажытным крыжом-рэліквіяй адправіліся пілігрымы па рацэ Вілii. Сустрэча воднай экспедыцыі адбылася напярэдадні свята ў нядзелю. Пасля для пілігрымаў было адслужана набажэнства. Апоўначы на 2 ліпеня пачалося надзвычай прыгожае дзеянне — прэцэсія са свечкамі і ўрачыстая Імша. Набажэнствы перад абразом Маці Божай, у тым ліку і па ўсходняму абраду, доўжыліся ўсю ноч і скончыліся апоўдні ўрачыстай святой Імшой, якую служыў Апостальскі Нунцый у Беларусі архіепіскап Марцін Відавіч і каталіцкія епіскапы Беларусі.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дзённік Вікі Ц.

Хутка-хутка наблізіцца магічная дата 7 ліпеня — 07.07.07, як прынята яе скарачаць. У сувязі з ёю ва ўсіх мінскіх ЗАГСах чакаецца такі бум, што я нават рада, што праўду гэты дзень далёка ад сталіцы. Тры сямёркі запар лічацца вельмі ўдалым спалучэннем; не ведаю, ці праўда, але мае знаёмыя набылі мо з дзесятак латарэйных білетаў на гэты дзень. А яшчэ ў гэтым месяцы 13-е чысло прыпадае якраз на пятніцу. Дробязь як быццам, а непрыемна, халадок па скуры. Усяго дзве лічбы, а якія розныя адчуванні!

Бальзак і ўсе астатнія

05.07.2007

Толькі скажыце, што вас пакідаюць раўнадушнымі гэтыя даты: 31 (снежня), 9 (мая), 8 (сакавіка), урэшце, уласны дзень нараджэння! Дарэчы, пра дзень нараджэння — гаворка асобная, бо гэта і карма, і пакаранне. Дакладней, натуральна, не сам дзень (нават калі гэта 29 лютага, што выпадае раз на чатыры гады), а ўзрост...

Сядзім у кампаніі былых аднакурсніц маёй прыяцелькі. Адна з захапленнем расказвае пра малога сына: «Нам паўгода ўжо стукнула, зусім вялікія! У манежыку так скача, як будучы Шумахер!». Другая абмяркоўвае па тэлефоне меню будучага банкету — плануе справіць маме шыкоўны 60-гадовы юбілей: «Усё ж такая дата — трэба, каб запомнілася». Усё гэта цягнецца амаль без пауз. А калі адна ўсё ж выпадае, мая прыяцелька ўздыхае з выглядам лебедзя, памерлага яшчэ на пачатку балета: «А мне хутка будзе 30». У яе вачах і голасе — непадробная трагічнасць. У мяне з гэтай нагоды маленькіх трагедый нават дзве: што падарыць дзяўчыне на юбілей (калекцыю дыскаў з серыялам «Сэкс у вялікім горадзе» не прапаноўваць), і як правільна падштурхнуць яе думкі і памкненні ў накірунку «жыццё яшчэ толькі пачынаецца».

Што яны з намі робяць, гэтыя абведзеныя чырвоным даты ў штодзённіку! Мне часам нават здаецца, што «востраў нешанцавання» без календароў быў не такім ужо і нешчаслівым. Які сёння дзень? А ніякі — проста сёння! Колькі табе гадоў? А не ведаю — учора было 900, заўтра будзе 17. Прыгажосць! Не тое што ў рэальным жыцці.

...У сем гадоў вельмі крыўдна, калі дарослыя на якое-небудзь пытанне паблажліва ўсміхаюцца і кажуць «вырасцеш—зразумееш». Калі там будзе тое ваша «вырасцеш», а зразумець я хачу зараз! Сацыяльна-ўзроставую справядлівасць адстаяць не ўдаецца — бацькі з сябрамі па-ранейшаму вядуць свае размовы на кухні за зачыненымі дзвярыма і запрашаюць на святы малазнаёмых цётак з дзецьмі — «вы абавязкова пасябруеце». У знак пратэсту я сыходжу ў эміграцыю ў куток за канапай, але гэтыя ўсюдыісныя дзеці прыходзяць і туды, бо ім хочацца пагуляць у кампаніі. Праз некалькі гадоў, калі «ўсюдыісныя дзеці» былі даўнімі сябрамі, маці распавяла мне гэту гісторыю, а я шчыра не паверыла. Маленькая была, што возьмеш.

У шаснаццаць, калі надышоў час атрымліваць пашпарт, варыянтаў будучага подпісу я распісала практычна ўвесь сшытак, выбіраючы найлепшы — гэта ж як другое «я». А потым з гонарам цягала дакумент, куды трэба і не трэба — а раптам спытаюць. Праз колькі гадоў мы з сяброўкамі, смеючыся, але перажываючы патаемную радасць, пераказваем адна адной, што пры набыцці піва ў кіёску строга запыталі: «А пашпарт ёсць?». Гэта ж трэба, які камплімент. Сёння гэта весела. А тады, у шаснаццаць, падобнае стаўленне абурала да глыбіні душы. Я дарослая, мне можна, вось, пашпарт ёсць! А табе ў адказ з'едлівае: 16 — гэта яшчэ не 18. А ў некаторых краінах паўналецце ўвогуле адлічваецца з 21 года...

На другім курсе адна з нашых дзяўчат сустракалася з мужчынам за 30. Тады мы яшчэ не ведалі пра «бальзакаўскі ўзрост» — Бальзака праходзілі толькі на трэцім — інакш прыдумалі б яго мужчынскі эквівалент. А так толькі здзіўляліся: ён жа стары-ы! Эх, сустрэла б я сёння сябе тагачасную, абавязкова сказала б колькі добрых слоў. Зрэшты, наўрад ці тагачасная я стала б слухаць «цётку», якой значна бліжэй да 30, чым да 20...

Толькі пасля гэтых самых дваццаці мы крыху ўцямілі, што жыццё ёсць не толькі на Марсе, але і за кожнай узроставай мяжой. Проста яно зусім рознае, са сваімі нераацэненымі каштоўнасцямі і сферай інтарэсаў. Бывае, канешне, што дарослы чалавек да сівізны «заграбае» ў дзіцячых захапленнях, а падлетак-вундэркінд абганяе сваіх аднагодкаў на пакаленне — але гэта, хутчэй, выключэнні. Я паступова звыклася з тым, што зварот на «ты» да 30-гадовай калегі — нармальная з'ява, і аціаніла харство ўзросту, з якога нават бацькі прызнаюць цябе (з агаворкай «больш-менш») самастойным чалавекам. Але адначасова пачалі звінець першыя трывожныя званочкі: адна былая аднакласніца ўжо нарадзіла першынца, другая дык і развесціся паспела, а бацькі гэтак ненавязліва намякалі, што і мне — ці не пара па парах? А тыя ж самыя сяброўкі, якія некалькі гадоў таму смяяліся са «старога 30-гадовага», цяпер здзіўлена пытаюцца: «Як? Ён маладзейшы за цябе?!». Пасля гэтага адчуваеш сябе апошняй распусніцай, хочацца пасыпаць галаву попелам, а для вернасці яшчэ засунуць у пясок, як стравус, і жыць у такім стане да старасці. Ці хоць бы да 30.

Чым бліжэй да гэтага ўзросту (ат, каб на цябе, Бальзак!), тым больш забаўнымі робяцца многія рэчы. Напрыклад, калі апошнім аргументам у спрэчцы ідзе рэпліка: «Ну, я ж старэйшы!». Міжволі ўсміхаюся. Але не больш. Гэта падлеткі няхай рагочуць як коні (за сцяной яны рагочуць трэцюю гадзіну — абкурыліся, ці што?), а мяне ўжо мала якія рэчы смешаць да слёз, хіба толькі забаўляюць. Забаўляе катэгарычнасць першакурснікаў, якія «на сто працэнтаў ведаюць», кім стануць і дзе будуць праз 10 гадоў. І той дзіўны 15-гадовы падлетак, які жадае са мной сябраваць. «А калі б я быў старэйшы, то жанаціся б з табой», — выдае ён у электроннай перапісцы. Я адказваю, што жыццё ўвогуле несправядлівая штука, і што да яго паўналецця мне якраз стукне 30 — па мерках яго пакалення, «старая вешалка». Карацей, вырасцеш — пагаворым...

А на подступах да гэтай мяжы, як магу, суцяшаю прыяцельку, якой 30 ужо праз месяц. Бо заўжды знойдзецца нехта — маладзейшы або старэйшы, патрэбнае падкрэсліць — за цябе. Будзе нехта мацнейшы, разумнейшы, прыгажэйшы, таленавіцейшы, здаравейшы або багацейшы. Але такога, як ты — не будзе. І Бальзак тут ні пры чым. А націск на словах «ужо» ці «яшчэ» паставіш самастойна.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.45	21.43	16.58
Віцебск —	4.26	21.40	17.14
Магілёў —	4.35	21.33	16.58
Гомель —	4.41	21.20	16.39
Гродна —	5.02	21.56	16.54
Брэст —	5.12	21.48	16.36

Імяніны

Пр. *Ульяны, Генадзя, Яўсея;* ***К.*** *Зоі, Караліны, Марыі, Антона, Апанаса, Міхаіла, Якуба.*

Месяц

Апошняя квадра 7 ліпеня.
Месяц у сузор'і Рыб.

Па звестках Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы БДУ

Прагнозныя значэнні УФ-індэкса для г. Мінска і Мінскай вобласці на 05.07.2007

Экстрэмальны ..... 11+
Вельмі высокі ..... 8—10
Высокі ..... 6—7
Умераны ..... 3—5
Нізкі ..... 1—2

Для бязвоблачнага неба — UV INDEX 6,6

З улікам прагназуемай воблачнасці — UV INDEX 3,3

З **11** да **15** гадзін дня час бяспечнага знаходжання на сонцы для людзей з адчувальным тыпам скуры — **15 хвілін**.

Надвор'е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА	+10 — +12 °C	МАСКВА	+23 — +25 °C
ВІЛЬНЮС	+12 — +14 °C	РЫГА	+14 — +16 °C
КІЕЎ	+19 — +21 °C	С-ПЕЦЯРБУРГ	+20 — +22 °C

Без ападкаў

НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў ЛІПЕНІ

6, пятніца 5.00—10.00
8, нядзеля 12.00—17.00
10, аўторак, 16.00—19.00
12, чацвер 20.00—21.30
14, субота 12.00—22.30
15, нядзеля 0.00—1.30
17, аўторак 3.00—8.30
19, чацвер 12.30—18.30
22, нядзеля 5.30—7.30
24, аўторак 9.30—19.30
27, пятніца 0.00—5.30
29, нядзеля 1.30—12.30
31, аўторак 11.00—16.30

Дзве даты

5 ліпеня

1682 год — стараверамі — бежанцамі з Цэнтральнай Расіі, на рацэ Сож заснавана слабада Ветка (сёння — горад у Гомельскай вобласці). Менш чым праз два стагоддзі тут ужо сфармаваліся мясцовыя асаблівасці іканапісу і афармлення рукапіснай кнігі, склалася самабытная школа веткаўскай разьбы. Карныя войскі царскага ўрада двойчы спальвалі мястэчка, высяляючы насельніцтва ва ўсходнія раёны Расіі. У тыя часы Ветка належала вядомым магнатам Халецкім, якія карысталіся гербам «Абданк» — на чырвоным полі сярэбраная літара W. Сення гэта афіцыйны герб горада.

1857 год — нарадзілася Клара Цэткін, нямецкая фемністка, заснавальніца кампартыі Германіі, ініцыятар святкавання Міжнароднага жаночага дня.

Цытата дня:

«Скажы яму, што на небе 9783462575688759 зорак, — і ён паверыць. Але скажы яму, што гэтую лаўку толькі што пафарбавалі, — і ён абавязкова дакранецца да яе пальцам».

Джордж Бернард Шоў (1856—1950), англійскі драматург.

Сардэчна віншуем з днём нараджэння шаноўную **Валянціну Мацвееўну СЛАБАДА** з в. Стараволя. Хай анёл ваша жыццё беражэ, а мы жадаем шчасця, здароўя, радасці ў жыцці.

Суседзі, *Пружанскі раён.*

Дарагога і любага мужа, тату і дзядулю **Зыгмунда Уладзіслававіча ГРЫКЕНЯ** віншуем з 70-годдзем! Мы кажам табе словы прызнання і ўдзячнасці.

Просім Бога, каб жыццё тваё збярог,
Каб заўсёды нас прыводзілі дарогі
На знаёмы, родны нам парог.

З павагай жонка, сыны, нявестка, дачка, зяць, унукі Валодзя, Дзіма, Саша, Аліна, Юля, Ігар.

Усміхнёмся!

Пасяджэнне суда па ўстанаўленню бацькоўства. Судовы прыстаў:

— У сувязі з тым, што мяркуемы бацька дзіцяці ад удзелу ў экспертызе адмовіўся, пробы генетычнага матэрыялу былі ўзятыя ў яго бацькоў, г.зн. у бабулі і дзядулі дзіцяці. Праведзеная экспертыза паказала, што мяркуемая бабуля (узор J3MS314) на самай справе з'яўляецца бабуляй дзіцяці, а мяркуемы дзядуля (узор J4MS314) дзядулем дзіцяці не з'яўляецца.

Цішыня ў зале, паўза. Раптам істэрычны жаночы крык:

— Д'ябал! Дурная была задума... Воўчык, Воўчык! Толькі без рук — я ўсё патлумачу!

☺

Сапраўдны цар звяроў — дырэктар заапарка.

☺

Прафесар філалогіі:

— Прывядзіце прыклад пытання, каб адказ гучаў як адмова і адначасова як згода.

Студэнт:

— Гэта проста: «Гарэлку піць будзеце? — Ай, пакіньце!»

Экслібрыс «Звязды»

ПА СЛЯДАХ АГЕНТАЎ...

Новая кніга Леаніда Юнчыка, лаўрэата прэміі імя Дзмітрыя Холадава «За мужнасць і прафесіяналізм» Міжнароднай канферэнцыі журналісцкіх саюзаў і іншых прэстыжных узнагарод — вынік нястомных пошукаў аўтара, своеасаблівая справаздача перад чытачамі да свайго 50-годдзя і 30-годдзя творчай дзейнасці. Усе героі кнігі «Па слядах агентаў» не прыдуманыя, а рэальныя людзі, што надае асаблівы каларыт і сацыяльную значнасць расследаванням журналіста.

Тэма выкарыстання тайных агентаў у аператыўна-вышуковай дзейнасці па лініі МУС з'яўляецца даволі засакрэчанай і трапляе на старонкі газет не вельмі часта.

— У сваёй кнізе я аналізую розныя старонкі жыцця сакрэтных агентаў, — патлумачыў у размове з намі Леанід Юнчык. — Мне хацелася адказаць на пытанне, ці можна ў любым выпадку і па любых злачынствах выкарыстоўваць метад аператыўнага эксперыменту.

На самай справе тайныя агенты даволі шырока ўвайшлі ў наша жыццё. Якія метады яны выкарыстоўваюць і ці заўсёды яны апраўданы? Ці цяжка быць агентам?

Мабыць, сёння без людзей гэтай прафесіі нельга абысціся, асабліва калі гаворка ідзе аб прадухіленні тэрарызму або іншых страшных злачынствах. Ці трэба злоўжываць выкарыстаннем аператыўных эксперыментаў, напрыклад, у выпадках з дачай хабару людзям, якія да гэтага ніколі не канфліктавалі з законам?

На гэтыя і іншыя пытанні ў сваім глабальным журналісцкім расследаванні дае адказ наш калега з газеты «Рэспубліка» Леанід Юнчык у кнізе «Па слядах агентаў...».

Сяргей КУРКАЧ.

Рубрыку вядзе Мікола ДЗЯВЁЛА.

Аўтапарады

СЕМ ПРАВІЛАЎ БУКСІРОЎКІ

Кожны аўтамабіль, нават самы надзейны, можа сапсавацца. Прычым па «закону падаючага бутэрброда», паломкі звычайна адбываюцца ў дарозе, удалечыні ад станцый тэхнічнага абслугоўвання і службаў аварыйнай дапамогі. У такіх выпадках застаецца разлічваць толькі на «шафёрскую салідарнасць». І спагадлівыя вадзіцелі, якія возьмуць вас на буксір, заўсёды знойдуцца. Аднак, каб паспяхова, без аварый дабрацца да бліжэйшай майстэрні, прапануем вашай увазе, паважаныя аўтааматары, асноўныя правілы буксіроўкі.

1. У якасці буксіра лепш за ўсё падыходзіць сінтэтычная вяроўка, якая змякчае рыўкі. Ланцуг, дрот ці металічны трос выкарыстоўвайце толькі ў самых бязвыхадных сітуацыях, калі нічога іншага пад рукой няма.

2. Усіх пасажыраў пажадана перасадзіць у «вядучы» аўтамабіль. Лёгкую машыну зручней буксіраваць. Да таго ж пасажыры змогуць увесь час сачыць за «вядомым» аўто і падказваць вадзіцелю ў выпадку ўзнікнення небяспечных сітуацый.

3. Перад пачаткам буксіроўкі вадзіцелі павінны не толькі ўключыць адпаведна бліжняе святло і «аварыйку», а пры яе адсутнасці павесіць адмысловы знак, але і ўзгадніць, які жэст рукой што абазначае, каб не ўзнікла непаразуменняў.

4. Бакавыя шыбы абодвух аўтамабіляў павінны быць адчынены, каб у выпадку неабходнасці можна было падаць сігнал рукой і пачуць гукавыя сігналы.

5. Крананне з месца, пераключэнне перадач павінна быць плаўным, інакш у «вядучым» аўтамабілі можа сапсавацца счапленне. Буксіроўшчык звычайна рухаецца на другой альбо трэцяй перадачы.

6. Трос павінен увесь час быць нацягнуты. За гэтым абавязаны сачыць найперш вадзіцель буксіруемага аўтамабіля: своечасова плаўна прытарможваць.

7. Калі ў вас машына з аўтаматычнай каробкай пераключэння перадач, то яе можна буксіраваць з хуткасцю не больш за 50 кіламетраў у гадзіну і на адлегласць не далей чым 25 кіламетраў.

Аўтапарк

МІНСКІЯ ПЕРАГРУЗКІ

Прыкладна 75 працэнтаў цэнтральных вуліц беларускай сталіцы перагружаны аўтатранспартам.

Такую інфармацыю паведаміў падчас прэс-канферэнцыі намеснік начальніка ўпраўлення Дзяржаўтаінспекцыі ГУУС Мінгарвыканкама Канстанцін Страх. Паводле яго слоў, толькі за 1 гадзіну ў межах першага гарадскога кальца (праспект Машэрава, вуліцы Бядулі, Першамайская, Ульянаўская, Цэткін, Бабруйская) праязджаюць 20 тысяч аўтамабіляў. Увогуле, зараз у сталіцы зарэгістравана больш за 577 тысяч транспартных сродкаў. Штогод мінскі аўтапарк павялічваецца ў сярэднім на 12—15 працэнтаў.

Аўтапаліва

ДЗЕ «КУСАЮЦЦА» АЗС?

Да ўвагі айчынных аўтааматараў, якія збіраюцца ў падарожжа па Еўропе. Спецыялісты нямецкага аўтаклуба ADAC правялі даследаванне з мэтай вызначыць, у якіх краінах Заходняй Еўропы самае дарагое і самае таннае паліва. У гэтым своеасаблівым спаборніцтве цэн «пальму першынства» другі год запар утрымлівае Галандыя. Кошт 1 літра бензіну маркі «Super» (беларускі аналаг «АИ-98») у гэтай краіне складае 1,51 еўра. Крыху таннейшы бензін у Даніі — 1,49 еўра, у Бельгіі — 1,31 еўра, у ФРГ — 1,31 еўра. А выгаднейшая за ўсё бензінам запраўляцца ў Швейцарыі, Чэхіі і Іспаніі, дзе ён каштуе адпаведна 1,02 еўра, 1,03 еўра і 1,08 еўра за літр.

А вось з дызпалівам цэнавая сітуацыя іншая. Самая дарагая салярка ў Даніі і Італіі: адпаведна 1,26 еўра і 1,21 еўра за літр, а самая танная — у Люксембургу: — 0,92 еўра за літр.

САЛЯРКА З КУРЫНАГА ТЛУШЧУ

Амерыканская харчовая карпарацыя «Tyson Foods» заявіла аб намеры пабудаваць завод па вытворчасці дызпалівa з курынага тлушчу.

Прадпрыемства пачне выпуск паліва ў 2010 годзе. Плануемая магутнасць — 284 мільёны літраў у год. А першы кантракт на пастаўку 1900 літраў эксперыментальнай «курынай саляркі» ўжо заключаны з ваенна-паветранымі сіламі ЗША.

Аўтаколер

СМАЧНА ЕЗДЗІЦЬ!

Сёлета ў мадэляў аўтамабіляў «Ford» з'явілася вялікая колькасць «смачных» колераў. У прыватнасці, «Lincoln MKX» пафарбавалі ў «крэм-бруле», «Lincoln Navigator» — у «белы шакалад», «Ford Freestyle» — у «мерло», «Escape» — у «апельсінавы мароз», «Mustang» — у «залаты лімон», «Explorer» — у «цёмную вішню». На думку віцэ-прэзідэнта кампаніі Дж. Мэйса, назвы, якія выклікаюць «харчовыя» асацыяцыі, вельмі прыцягваюць пакупнікоў. Да таго ж, яны хутчэй запамінаюцца.

Аўтарарытэт

ПАРАМАБІЛЬ ПОЙДЗЕ З МАЛАТКА

Самы стары ў свеце аўтамабіль выстаўлены на аўкцыёне ў Каліфорніі. Машына была створана ў 1884 годзе і да гэтага часу не сапсавалася. Праўда, каб зрушыць транспартны сродак з месца, яго трэба «раскачагарваць» каля 30 хвілін — машына працуе на «гарачай вадзе». Максімальная хуткасць парамабіля — 61 кіламетр у гадзіну. Першапачатковы кошт рарытэта складае 2 мільёны долараў.

Аўтажарт

«Дайшнік» у рэшце рэшт дагнаў аўтамабіль і прымусіў яго спыніцца.

— Чаму вы не спынілі-ся, калі я вам свістаў? — пытаецца міліцыянер у вадзіцеля.

— А я не чуў!

— Так і запішам у пратаколе: «перавысіў хуткасць гуку».

У суд Лідскага раёна Гродзенскай вобласці паступіла заява аб аб'яўленні памерлым **Лаўскага Васіля Іванавіча**, 5 сакавіка 1944 года нараджэння, ураджэнца в. Крываногава Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці, жыхара г. Бярозаўка (вул. Дзяржынскага, д. 116). Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якім што-небудзь вядома пра В.І. Лаўскага, паведаміць іх суду Лідскага раёна (тэл. 25-943) на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПЕРЕНОСЕ ДАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА.

ЗАО «ВЦ «АКВАБЕЛ» Минский район проводит открытый аукцион по продаже объекта недвижимого имущества:

№ лота	Наименование объекта недвижимости	Общая площадь, кв.м	Жилая площадь, кв.м	Начальная цена за 1 кв.м, у.е.	Адрес объекта
1	Квартира № 55	141,6	79	1 800	г. Минск, ул. Беломорская, 4а
2	Квартира № 61	142,3	78,4	1 800	г. Минск, ул. Беломорская, 4а

1 у.е. равен 1 доллару США по курсу НБ РБ на день произведения оплаты.

Задаток в размере 10% от стоимости лота перечисляется на р/с № 3012204960010 в филиале ОАО «Белагропромбанка» МГД г. Минск, ул. Ольшевского 24, код 963, УНН 600438617, ОКПО 28976346, ЗАО «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район. Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 10 дней от даты подписания протокола о результатах аукциона. Аукцион состоится 16 июля 2007г. в 11.00 по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и МКАД, Административное здание, отдел коммерческой недвижимости. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 14.07.2007 г. до 17.30 по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и МКАД, Административное здание, отдел коммерческой недвижимости.

Контактный телефон: (8-017) 237-93-93.

«ПРИОРБАНК»

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО

извещает своих акционеров, что 17 июля 2007 года состоится внеочередное общее собрание акционеров банка

Собрание состоится в г. Минске по адресу: ул. В. Хоружей, 31 А.

Форма проведения Собрания – заочная.

Выдача бюллетеней для голосования производится в Центральном офисе «Приорбанк» ОАО по адресу г. Минск, ул. В. Хоружей, 31А с 4 июля 2007 года, а акционерам, являющимся в совокупности владельцами 0,1 (одной десятой) % акций и более направляются заказным письмом.

Заполненные бюллетени предоставляются в «Приорбанк» ОАО по адресу 220002, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31А не позднее 13 июля 2007 года.

Бюллетень может быть передан почтовой связью либо лично акционером/представителем акционера. При передаче бюллетеня почтовой связью дата поступления бюллетеня определяется по дате регистрации входящей корреспонденции соответствующей службой банка.

Повестка дня:

1. Избрание Наблюдательного Совета банка.

Наблюдательный Совет «Приорбанк» ОАО.

БЕЛАРУСБАНК 1922-2007 85 ЛЕТ

Готовитесь к отпуску?
Опасаетесь за безопасность ваших наличных?

АСБ «Беларусбанк» предлагает
БЕЗ КОМИССИИ
приобрести дорожные чеки American Express.
Обратная продажа неиспользованных дорожных чеков, ранее приобретенных в учреждениях АСБ «Беларусбанк», осуществляется также
БЕЗ КОМИССИИ.
Более 300 подразделений АСБ «Беларусбанк», осуществляющих операции с дорожными чеками, по всей территории Республики Беларусь к вашим услугам!

Адреса пунктов продажи дорожных чеков:
http://www.belarus-bank.by
Тел. (017) 289 38 10.

Путешествуйте с уверенностью!
Безопасность Ваших сбережений обеспечивает Компания American Express.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 27.10.2006 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь.

Лицензия № 02200/0247731 на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, зарегистрирована в реестре лицензий Министерства финансов Республики Беларусь 25.04.2007 г. за № 5200-1246-905, срок действия — до 29.07.2007 г.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287-19-19 (тэл/факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zviazda.by **E-mail:** info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 34.118. Індэкс 63850. Зак. № 3592. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12